Родная газета на родной мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

20 СНЕЖНЯ 2007 г.
ЧАЦВЕР
№ 242 (26107)

Кошт 380 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## СА «ЗВЯЗДОЙ» — У НОВЫ ГОД

**Працягваецца падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2008 года. Падпісныя цэны на газету «Звязда» (у рублях)**

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы | на 6 месяцаў |
|---|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8800 | 26400 | 52800 |
| 63145 (індывідуальны льготны для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 8300 | 24900 | 49800 |
| 63858 (ведамасны) | 14000 | 42000 | 84000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 12800 | 38400 | 76800 |

## «Прамая лінія»: толькі ў «Звяздзе»!

### БУДЗЬ ЗДАРОВЫ, НЕ КАШЛЯЙ!

Аб захворваннях органаў дыхальнай сістэмы, аб тым, як распазнаць першыя прыметы ангіны і пнеўманіі, астмы і грыпу, аб наступствах цяжкіх хвароб лёгкіх і метадах іх лячэння мы пагаворым на чарговай «прамой лініі». У ёй возьме ўдзел **кіраўнік аддзела дыягностыкі і тэрапіі неспецыфічных захворванняў органаў дыхання НДІ пульманалогіі і фтызіятрыі Ірына Міхайлаўна ЛАПЦЕВА.** «Прамая лінія» адбудзецца ***21 снежня ў пятніцу з 12.00 да 13.30 па тэлефонах 8(017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8(017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).***

Парламенцкі дзённік

# ДАХОДЫ НАСЕЛЬНІЦТВА Ў 2008-М БУДУЦЬ РАСЦІ

## *паабяцалі дэпутатам члены ўрада*

**Абедзве палаты беларускага парламента правялі ўчора ў Авальнай зале сумеснае пасяджэнне, на якім заслухалі традыцыйны, штомесячны, даклад урада. Разглядаліся наступныя пытанні**

### АБ ЗАДАЧАХ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ

Яны сапраўды маштабныя, бо, як сказаў віцэ-прэм'ер Іван Бамбіза, у 2008 годзе ў краіне плануецца сабраць 7 млн 800 тыс. тон збожжа — гэта істотна больш, чым было сабрана сёлета. Пры гэтым у Беларусі будзе захавана бюджэтнае субсідзіраванне сельскагаспадарчай вытворчасці. «Датацыі вёсцы захаваюцца зараз і ў перспектыве, хоць мы і марым пра бездатацыйную сельскую гаспадарку, бо сёння ў свеце няма ніводнай краіны, якая б не падтрымлівала сваіх сельгасвытворцаў», — заявіў Іван Бамбіза. Паводле слоў віцэ-прэм'ера, датацыі складаюць да 50 працэнтаў ад кошту прадукцыі, а зменшыць уліванне дзяржавай грошай сельгаскааператывам можна толькі пры адной умове — шырокім прытоку ў вёску інвестараў.

Таксама Іван Бамбіза нагадаў, што прынята рашэнне не закупляць больш імпартную сельскагаспадарчую тэхніку. «У нас ёсць «Гомсельмаш», МАЗ, МТЗ, іншыя прадпрыемствы, якія ў дастатковай колькасці вырабляюць якасную тэхніку і агрэгаты — мы павінны падтрымаць і іх, таму ўрад у будучым годзе накіроўвае больш як 1 трлн рублёў менавіта на закупку айчынных сельскагаспадарчых машын». У той жа час ён не выключыў таго, што закупкі будуць рабіцца і за мяжой, але, паводле яго слоў, толькі тая тэхніка, якая ў нас не вырабляецца (напрыклад, трактары магутнасцю 300 тысяч конскіх сілаў), але ў асноўным гэта будзе тэхналагічнае абсталяванне. Спецыяльна сродкаў пад гэта выдзяляць не плануецца, але калі канкрэтныя гаспадаркі звернуцца ва ўрад і абгрунтуюць такое рашэнне, то ім будзе аказана падтрымка з бюджэту.

Іван Бамбіза пры гэтым адзначыў, што рэзкага павышэння цэнаў на прадукты харчавання ў краіне ў наступным годзе не будзе. «Цэны на харчовыя тавары, асабліва сацыяльна значныя, у нас у разы ніжэй, чым у суседзяў, у дастатковых аб'ёмах вырабляецца малако, мяса, сыры, і рэзкага павышэння кошту гэтых прадуктаў быць не можа», — сказаў ён, у той жа час нагадаўшы, што паколькі Беларусь і Расія знаходзяцца ў адзінай эканамічнай прасторы, таму неабходна захоўваць прапорцыю па павышэнні цэнаў на прадукты харчавання. Інакш мы можам сутыкнуцца з іх несанкцыянаваным вывазам за мяжу. «І ўсё ж трэба імкнуцца павышаць грашовыя даходы насельніцтва, а не ўзнімаць цэны — такая галоўная задача ўрада», — зрабіў заключэнне Іван Бамбіза.

### ЖЫЛЛЁВАЕ БУДАЎНІЦТВА І ЖКГ

Наогул, на думку членаў урада, якія выступалі перад дэпутатамі, увесь народнагаспадарчы комплекс краіны налета будзе развівацца больш дынамічна. Даходы насельніцтва павінны вырасці на 16—19 працэнтаў, у строй будзе ўведзена 5,2 млн кв. метраў жылля (4,7 млн — сёлета). Пры гэтым урад прыме ўсе меры для стрымлівання цэнаў на будаўніцтва жылля больш строгім кантролем як цэнаў на паслугі будаўнічых арганізацый, так і на будаўнічыя матэрыялы. З 2008 года аб'ёмы жыллёвага будаўніцтва будуць штогод істотна павялічвацца, і да 2011 года яны могуць быць павялічаны да 10 млн кв. метраў. У Беларусі хапае будаўнічых матэрыялаў, і цяпер неабходна павялічыць колькасць будаўнічых арганізацый і кампаній. Паводле прагнозаў міністра архітэктуры і будаўніцтва Аляксандра Селязнёва, у 2008 годзе камерцыйныя цэны на жыллё не перавысяць 2 тысяч долараў за 1 квадратны метр. «Калі мы выйдзем на запланаваныя тэмпы будаўніцтва, то цэны пойдуць уніз, а жыллёвая праблема страціць сваю вастрыню», — заявіў ён.

Што датычыцца цэнаў на паслугі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, то, паводле слоў кіраўніка гэтага ведамства Уладзіміра Белахвостава, яны ў 2008 годзе павысяцца на 5 працэнтаў, бо дзяржава па-ранейшаму бярэ на сябе ўвесь цяжар па падарожанні энерганосьбітаў. «Павышэнне цэнаў будзе разавым, хоць гэта пагражае вялікімі стратамі жыллёва-камунальнай гаспадаркі і прадпрыемствам энергетыкі», — сказаў Уладзімір Белахвостаў. Ён таксама паведаміў, што грамадзянам, якія за ўласны кошт устанавілі ў кватэрах лічыльнікі, плануецца аднавіць ільготу на аплату вады. Гэтае пытанне будзе вырашана яшчэ да канца года.

### ПАВЫШЭННЕ СТУДЭНЦКІХ СТЫПЕНДЫЯЎ

З новага года памер стыпендый для студэнтаў будзе павышаны на 7—8 працэнтаў, паведаміў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. Паводле яго слоў, студэнцкая стыпендыя ў Беларусі адна з самых высокіх у СНД і дасягае амаль 50 долараў у эквіваленце. Таксама за кошт стыпендыяльнага фонду навучальных устаноў мяркуецца кампенсаваць праезд катэгорыям навучэнцаў і студэнтаў, якія маюць у гэтым патрэбу (пры гэтым парог патрэбнасці павялічаны). Іншагароднія змогуць разлічваць на кампенсацыю праезду дадому 2 разы ў месяц, а калі жывуць у прыгарадзе — то 4 разы ў месяц. Аплата праезду будзе правадзіцца пры прад'яўленні праязнога дакумента. Плануецца, што са студзеня 2008 года ў навучальных установах пачнуць працаваць камісіі па аказанні матэрыяльнай дапамогі ў аплаце праезду. ВНУ краіны змогуць аказваць матэрыяльную дапамогу сваім студэнтам і за кошт пазабюджэтных сродкаў.

### ПАВЫШЭННЕ МІНІМАЛЬНАЙ ЗАРПЛАТЫ І ВОДПУСКІ

На працягу апошніх пяці гадоў у Беларусі трывала назіраецца рост рэальных грашовых даходаў насельніцтва. І ў той жа час, ёсць і нізкія даходы, і высокія. Таму праблему, звязаную з павышэннем мінімальных дзяржаўных гарантый у сацыяльна-працоўнай сферы неабходна вырашаць тэрмінова. Сёлета «мінімалка» складае 108 працэнтаў бюджэту пражыткавага мінімуму, а ў 2008 годзе, як заявіла першы намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Алена Колас, плануецца павялічыць яе да 120 працэнтаў БПМ. Да канца ж пяцігодкі памер «мінімалкі», як чакаецца, дасягне ўзроўню мінімальнага спажывецкага бюджэту. Зараз жа, напярэдадні чакаемага росту цэнаў на паслугі ЖКГ, Міністэрства працы і сацабароны выйшла з прапановай аб павышэнні тарыфнай стаўкі першага разраду з 1 студзеня 2008 года, ну а калі будзе адчувальнай інфляцыя, то ў краіне працягвае дзейнічаць закон аб індэксацыі даходаў насельніцтва, які дазваляе абараніць нізкадаходныя групы грамадзян.

Як вядома, з наступнага года працоўны адпачынак будзе складаць 24 каляндарныя дні. У сувязі з гэтым цяпер дапрацоўваецца пералік пасад, для якіх можа быць прадастаўлены водпуск большай працягласці. Як сказала Алена Колас, існуе спецыфіка дзейнасці некаторых устаноў, напрыклад, праца з цяжкімі падлеткамі, дзецьмі-сіротамі, інвалідамі і інш. Таму плануецца захаваць большую працягласць водпускаў для моладзі (да 18 гадоў), работнікаў аварыйна-выратавальных службаў, інвалідаў і тых, хто працуе на тэрыторыях, пацярпелых ад аварыі на ЧАЭС. А вось што датычыцца водпускаў, звязаных са стажам работы ці ненармаваным працоўным днём, то яго працягласць могуць вырашаць наймальнікі.

**Анатоль СЛАНЕЎСКІ.**

Фота Уладзіміра ЧОСНЫХ.

# *Дзед Мароз* — чырвоны нос, зялёны берэт

У беларускіх памежнікаў — папаўненне. Новым вартавым рубяжоў нашай Радзімы стаў... Дзед Мароз. І гэта невыпадкова. Бо белавежская рэзідэнцыя Дзядулі знаходзіцца ў памежнай зоне. Так што фактычна ён быў памежнікам. А ўручаны самім старшынёй Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Ігарам Рачкоўскім сімвалічны зялёны берэт і дыплом афіцыйна замацаваў новы статус Дзеда Мароза. Апроч дакумента і адмысловай формы, «навабранец» атрымаў ад генерала Рачкоўскага падарунак: шчаня лабрадора. Што таксама зразумела. Які ж памежнік без сабакі! Зрэшты, Дзядуля Мароз памежнік незвычайны. Адразу ж пасля пасвячэння ў памежнікі ён атрымаў і павышэнне па службе: быў прызначаны начальнікам Навагодняй заставы. Незвычайным быў і першы загад галоўнага белавежскага памежніка. Ён загадаў пагранічнаму наряду не толькі заступіць на ахову навагодніх рубяжоў. Сімвалічны пагранічны слуп з нумарам «2008» ужо ўстаноўлены на тэрыторыі рэзідэнцыі. Да таго ж, у навагоднюю ноч, па загаду свайго новага начальніка памежнікі павінны будуць бесперашкодна прапусціць на Захад праз Дзяржаўную мяжу новы, 2008-ы год.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## Навучэнска-студэнцкі ўнівермаг

У Беларусі мэтазгодна разгледзець пытанне аб стварэнні навучэнска-студэнцкага ўнівермага. Такую думку выказаў у час наведвання выстаўкі-кірмашу-шоў «Нашым дзецям» віцэ-прэм'ер Беларусі Аляксандр Косінец. Ён падкрэсліў, што ў такім магазіне навучэнцы ПТВ, а таксама студэнты ССНУ маглі б прадаваць вырабленую імі ў час вытворчай практыкі прадукцыю. Напрыклад, хлебабулачныя вырабы, адзенне і абутак, упрыгажэнні і інш.

**БЕЛТА.**

## БНТУ першы з ВНУ Беларусі выдзеліў сродкі на набыццё праязных для студэнтаў

Як расказала карэспандэнту БЕЛТА намеснік міністра адукацыі Таццяна Кавалёва, Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт з пазабюджэтных сродкаў закупіў праязныя білеты на снежань, якія атрымалі маючыя патрэбу студэнты. У кожнай навучальной установе (ПТВ, ССНУ або ВНУ) да пачатку 2008 года будуць створаны спецыяльныя камісіі, якія надзелены паўнамоцтвамі разглядаць звароты навучэнцаў і студэнтаў аб прадастаўленні ім дапамогі на куплю праязных білетаў. Паводле слоў намесніка міністра, крытэрый патрэбнасці будзе крыху вышэйшы, чым гэта было раней.

# ЮБИЛЕЙНАЯ ДАТА ЗАКРЫТАЙ СЛУЖБЫ

**Напярэдадні 90-годдзя з дня свайго ўтварэння Камітэт дзяржбяспекі гасцінна расчыніў дзверы ўласнага гісторыка-дэманстрацыйнага цэнтра — музея, які стане даступным для шырокіх экскурсійных аглядаў. Сярод першых жа наведвальнікаў быў заўважаны не толькі старшыня камітэта Юрый Жадобін, але і тыя, дзякуючы каму дадзеная падзея стала магчымай, напрыклад, супрацоўнікі цэнтральнага архіва і мастакі.**

Паводле слоў галоўнага спецыяліста, кандыдата гістарычных навук Артура Зельскага, канцэпцыя рэканструкцыі колішняга музея была распрацавана яшчэ ў 2004-м, летась у свет выйшла кніга «Шчыт і меч Айчыны», на аснове якой і была створана цяперашняя экспазіцыя. Адразу варта заўважыць, што, згодна з планамі стваральнікаў абноўленага музея, пакуль гаворка ідзе пра першую, цэнтральную, экспазіцыйную частку. Яна і адсылае нас дзесьці да XIV—XV стагоддзяў, а дакладней, да тагачасных няхітрых метадаў і спосабаў перадачы «важнай дзяржаўнай інфармацыі» ад аднаго другому. Выстава прапануе гледачам і знаёмства з першымі, вядомымі нам на сёння, дэтэктарамі хлусні (з дапамогай, напрыклад, грэчкі: калі той, каго распытвалі, выплёўваў сухую грэчку, гэта давала падставы думаць, што ад лішняга хвалявання ў яго ў роце перасохла). Ёсць тут і арыгінальныя дакументы, якія ніколі яшчэ не выстаўляліся, з жыцця моцна залакіраванай у савецкія часы асобы — Ф.Э. Дзяржынскага. Захоўваецца сапраўдны сцяг 1927 года, створаны да 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі, фрэнч генерал-лейтэнанта і форма палкоўніка 30-х гадоў мінулага стагоддзя, канапа канца XIX — пачатку XX стагоддзя, якая, як мяркуецца, стаяла ў кабінеце вышэйшага кіраўніцтва органаў дзяржбяспекі. Прадстаўлены найбольш яркія асобы тых беларусаў, якія ўвайшлі ў гісторыю знешняй разведкі былога Саюза (пачынаючы з разведчыка № 1, завербаванага самім Дзяржынскім, — Філіпава). Абсталяваны і кабінет аператыўнага работніка Міністэрства дзяржбяспекі БССР канца 40-х — пачатку 50-х гадоў з рэчамі тых часоў... Экспазіцыя адлюстроўвае яшчэ шмат падзей з мінулага і цяперашняга жыцця органаў дзяржаўнай бяспекі. Зразумела, што далей дэманстрацыйны цэнтр будзе прырастаць і новымі стэндамі, і старымі, даступнымі для шырокага прагляду дакументамі.

*Калегіі Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, ваеннаслужачым, супрацоўнікам і ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі*

Паважаныя таварышы!

Сардэчна віншую вас са знамянальнай датай — 90-годдзем з дня ўтварэння органаў дзяржаўнай бяспекі.

Гісторыя Камітэта дзяржаўнай бяспекі — гераічны летапіс самаадданага і беззапаветнага служэння Айчыне многіх пакаленняў лепшых сыноў і дачок Радзімы.

Назаўсёды ва ўдзячнай народнай памяці застанецца подзвіг чэкістаў у гады Вялікай Айчыннай вайны. Праяўляючы бясстрашнасць, мужнасць і гераізм, яны бралі непасрэдны ўдзел у арганізацыі антыфашысцкага супраціўлення. Доблесна змагаліся ў дзеючай арміі і ў партызанскіх атрадах, уносячы свой уклад у Вялікую Перамогу над фашызмам.

Сёння на пярэднім рубяжы абароны незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу і эканамічных інтарэсаў нясуць службу верныя прадаўжальнікі лепшых традыцый старэйшых пакаленняў супрацоўнікаў дзяржбяспекі.

Вам даверана ўмацоўваць нацыянальную бяспеку, абараняць сваю краіну ад сучасных выклікаў і пагроз, якія зыходзяць ад міжнароднага тэрарызму, транснацыянальнай арганізаванай злачыннасці, дэструктыўных дзеянняў іншаземных спецслужбаў. Гэта цяжкая, але вельмі важная, адказная і ганаровая місія.

Перакананы, што супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнай бяспекі будуць з гонарам выконваць ускладзеныя на іх задачы, аддаваць усе сілы для працвітання Беларусі.

Шчыра жадаю вам усім новых поспехаў у адказнай дзейнасці на карысць нашай дзяржавы. Моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту вам, вашым родным і блізкім.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

— Вялікіх змяненняў тут не адбылося — па вялікім рахунку, у вас зніклі толькі сезонная скідка на праезд у міжгароднім аўтатранспарце і скідка па аплаце за тэлефон. З 17 снежня інваліды I і II груп маюць права на 90-працэнтную скідку з кошту лекаў ці перавязачных матэрыялаў (у выпадку наяўнасці адпаведных рэцэптаў і медыцынскіх заключэнняў), на бясплатны выраб і рамонт зубных пратэзаў (за выключэннем пратэзаў з каштоўных металаў), на забеспячэнне іншымі тэхнічнымі сродкамі сацыяльнай рэабілітацыі, перашкарговае бясплатнае санаторна-курортнае лячэнне не больш за адзін раз у два гады (для непрацуючых) ці забеспячэнне санаторна-курортным лячэннем на ўмовах частковай аплаты ў залежнасці ад даходу (для працуючых грамадзян гэтай катэгорыі), бясплатны праезд у гарадскім, прыгарадным пасажырскім транспарце і на міжгародніх аўтобусах у межах свайго раёна, нарэшце, на 50-працэнтную скідку з кошту тэхабслугоўвання і камунальных паслуг. Праўда, апошняя гарантыя датычыцца толькі інвалідаў I і II груп, якія не маюць працаздольных членаў сям'і, пражываюць адны, разам з інвалідамі гэтых жа груп ці непрацуючымі пенсіянерамі, што дасягнулі агульнага пенсійнага ўзросту.

І яшчэ адна заўвага. Цяперашняе заканадаўства вызначае, што прадастаўленне льгот па I і II групе будзе адбывацца толькі пры ўмове прызнання таго, што сама інваліднасць не наступіла ў сувязі з супрацьпраўнымі дзеяннямі, алкагольным, наркатычным ці таксічным ап'яненнем, а таксама ў сувязі з наўмысным пашкоджаннем уласнага здароўя.

**Сяргей ГРЫБ.**

***(Працяг будзе.)***

сур'ёзных парушэнняў канстытуцыйных правоў грамадзян, але і дыскрэдытуюць органы ўлады, падрываюць іх аўтарытэт. Сёлета органы бяспекі спынілі дзейнасць 270 службовых асобаў, якія ўчынілі карупцыйныя злачынствы. Ліквідаваныя 9 устойлівых злачынных груп агульнай колькасцю 80 чалавек, якія мелі дачыненне да арганізацыі кантрабандных каналаў, вымагання, разбою, крадзяжоў і іншых злачынстваў.

Камітэт дзяржаўнай бяспекі актыўна папярэджвае і спыняе спробы незаконнага выкарыстання дзяржаўных рэсурсаў. Так, сёлета ўдалося папярэдзіць такія страты на агульную суму каля 164 млрд рублёў.

У гэтым годзе выключана з незаконнага абароту 70 адзінак агнястрэльнай зброі, 23 тысячы розных боепрыпасаў, 76 кг выбуховых рэчываў.

У сучасных умовах расце роля КДБ у галіне папярэджвання экалагічных і тэхнагенных катастроф, перш за ўсё, з улікам намечанага будаўніцтва на тэрыторыі краіны ўласнай атамнай электрастанцыі.

Непасрэдны ўдзел у распрацоўцы і рэалізацыі найважнейшых дзяржаўных праграм бярэ галоўнае ўпраўленне ўрадавай сувязі камітэта, ад эфектыўнай работы якога залежыць сістэма кіравання дзяржавай.

На пытанне, ці можа апазіцыя з'яўляцца нейкай пагрозай з нагоды парламенцкіх выбараў, якія адбудуцца ў наступным годзе, Юрый Жадобін, у прывітанасці, адзначыў, што яму вядома, хто, праз каго будзе дзейнічаць і колькі грошай «укідваць» для дэстабілізацыі сітуацыі, аднак відавочную пагрозу з апазіцыйнага боку цяжка ўявіць, паколькі «таварыства дэструктыўных элементаў» налічвае 1767 чалавек, кожнага з якіх «мы ведаем па прозвішчах». Колькасць «элементаў» пастаянная, род заняткаў — не сакрэт: большасць асобаў «жыве на замежныя гранты».

Што датычыцца «гучных спраў», то зараз КДБ праводзіць расследаванне справы аб правядзенні капітальнага рамонту ў «Аэрапорце-2» і Нацыянальнай бібліятэцы. «Хутка перададзім справу ў суд, а заўчасна абвінавачваць кагосьці я не стаў бы», — сказаў Жадобін. Наогул у следчым ізалятары КДБ зараз знаходзяцца каля 40 чалавек.

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

# ПЕРШЫ БАНК БЕЛАРУСІ

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

*Банк прымае віншаванні...*

**Восемдзесят пяць годаў споўнілася самаму вядомаму і буйному банку ў нашай краіне — ААТ «Ашчадны банк Беларусбанк». Ён лічыцца першым правамерна. Найбольш вялікі па аб'ёму актываў і колькасці кліентаў (сярод якіх як тысячы фізічных укладчыкаў, так і вядучыя беларускія кампаніі і прадпрыемствы), банк з поспехам кіруе самай развітой сістэмай філіялаў, а па аперацыях на знешніх рынках і колькасці выдадзеных крэдытаў апярэджвае ўсіх канкурэнтаў. Нездарма на міжнароднай арэне ААТ «ААБ Беларусбанк» займае пачэснае месца сярод трох сотняў самых вялікіх у Еўропе, і ўваходзіць у ганаровую тысячу буйных банкаў свету.**

...А пачыналася ўсё са стварэння ў 1922 годзе ашчадных касаў. Без іх без уласнай крэдытна-фінансавай сістэмы не магла і не можа абыходзіцца ніводная дзяржава. Ва ўсе гады банк заставаўся разам з людзьмі. У час вайны былі арганізаваны палявыя ашчадныя касы, якія прымалі і выдавалі ўклады адразу ж на франтах. У мірны час банкаўская сфера пачала развівацца далей — з'яўляюцца паслугі безнаяўных разлікаў, усё расце і расце колькасць касаў у сельскай мясцовасці. Спачатку ў якасці эксперыменту праз ашчадныя касы пачынае выплачвацца заработная плата, а ў васьмідзесятых гадах з'яўляюцца першыя камп'ютары. У 1995 годзе шляхам зліцця Ашчаднага банка Рэспублікі Беларусь і Акцыянернага камерцыйнага банка «Беларусбанк» арганізавана ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк»...

***(Заканчэнне на 2-й стар.)***

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

***ОАО «АСБ Беларусбанк» сообщает, что с 24 декабря 2007 года устанавливаются (изменяются) следующие вознаграждения банка по операциям с карточками:***

- плата за блокировку банком международной карточки MasterCard (Mass, Business, Gold), VISA (Classic, Gold) в размере 25 долларов США, Maestro и VISA Electron — 2,5 доллара США;
- плата за утерю международной карточки MasterCard (Mass, Business, Gold), VISA (Classic, Gold) в размере 25 долларов США, Maestro и VISA Electron — 2,5 доллара США;
- минимальная сумма вознаграждения за снятие наличных денежных средств с использованием международной карточки VISA Electron стандарта EMV в банкоматах других банков (кроме банкоматов ОАО «БПС-Банк» и Национального банка Республики Беларусь) в размере 4 000 белорусских рублей, в других банках — 6 000 белорусских рублей;
- плата за снятие наличных денежных средств с отрицательного остатка счета (в пределах разрешенного овердрафта) с использованием международной карточки VISA Electron стандарта EMV, карточки Maestro и VISA Electron (для использования только в Республике Беларусь) в размере 1,5 % от суммы.

**http://www.belarusbank.by**

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 29.10.2007 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь.*

**УНП 100325912.**

## УГНАЎ ТРАЛЕЙБУС

Менш за пяць хвілін цешыўся беспрацоўны мінчанін, кіруючы тралейбусам, за руль якога ён сеў, каб угнаць машыну. 23-гадовага мінчаніна, які раней асуджаўся за крадзеж, зноў пацягнула на «подзвігі»: ён учыніў угон тралейбуса. Праўда, угоншчыка хутка затрымалі, ён змешчаны ў ізалятар часовага ўтрымання, ўзбуджана крымінальная справа.

**Ігар ГРЫШЫН.**

БЕЛАРУСБАНК 1922-2007 85 ЛЕТ

**Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк», расположенное по адресу: 220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32, сообщает о проведении 22 декабря 2007 года внеочередного Общего собрания акционеров в заочной форме со следующей повесткой дня:**

*1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.*

*2. О заключении сделки с аффилированным лицом ОАО «АСБ Беларусбанк» — ЧУП «АСБ Первая весна».*

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (не позднее 20 декабря), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 22 декабря) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

***Дата окончания приема бюллетеней — 20 декабря 2007 г.***

**Телефоны для справок: (8-017) 218 84 38, 218 84 04.**

**http://www.belarusbank.by** *УНП 100325912.*

КУРСЫ ВАЛЮТ

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

***Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 20.12.2007 г. (для б/н разлікаў)***

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 154,00 |
| 1 еўра | 3 097,78 |
| 1 латвійскі лат | 4 446,28 |
| 1 літоўскі літ | 897,14 |
| 1 чэшская крона | 118,29 |
| 1 польскі злоты | 856,38 |
| 1 расійскі рубель | 87,11 |
| 1 украінская грыўня | 426,01 |

***Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў***

***Цэнтрабанк РФ***

| | |
|---|---|
| USD | 24,7281 |
| 10 UAH | 48,6889 |
| 1000 BYR | 11,4555 |
| EUR | 35,5813 |

***Курс у гандлёвых кампаніях (на 19.12.2007 г.)***

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

*Падпішыцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ООО «Агенство Владимира Гревцова» УПН 10002407 Лицензия Минсвязи № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 до 02.05.2009*

«Прамая лінія»

# Ільготы. Ці падтрымка «з адрасам»?

**Сказаць, што гэта «прамая лінія» ўчора атрымалася «гарачай» — не сказаць нічога. За вельмі кароткі адрэзак часу ў рэдакцыю паступілі дзесяткі званкоў, часам даволі памяркоўных, а часам — і вельмі эмацыянальных. Зрэшты, па-іншаму быць не магло. Да апошняга часу льготамі карысталіся амаль дзве трэці жыхароў Беларусі, а адсюль — і значная колькасць зваротаў. Але аб усім па парадку. На пытанні чытачоў «Звязды» адказваюць начальнік Упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціна Пятроўна СЯРГЕЕВА, начальнік аддзела па справах ветэранаў і пажылых людзей Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Іван Пятровіч НАГІБІН, намеснік начальніка ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Аверкіеўна ЖЫЛЕВІЧ, намеснік начальніка ўпраўлення эканомікі Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ, намеснік начальніка ўпраўлення аўтамабільнага транспарту Міністэрства транспарту і камунікацый Юрый Віктаравіч КАРАВАЙКІН і кансультант упраўлення аўтамабільнага транспарту Мінтранса Алег Аляксандравіч БОЦІН.**

***— У кастрычніку гэтага года мне была вызначана I група інваліднасці, жыву разам з жонкай-пенсіянеркай. Скажыце, калі ласка, якія ў нас будуць ільготы?***

*Міхаіл Мікалаевіч Зубко, Нясвіжскі раён.*

***— Патлумачце, якія льготы захаваюцца ў інвалідаў II групы?***

*Уладзімір Уладзіміравіч Камароўскі, Валожынскі раён.*

Падрабязнасці ў наступным нумары.

Традыцыі

# Свята ахвярапрынашэння

Увесь мусульманскі свет адзначае сёння Курбан-Байрам. «Курбан» азначае «ахвярапрынашэнне жывёлы», «байрам» — свята. Свята гэтае спалучае паломніцтва (хадж) у свяшчэнныя мясціны Саудаўскай Аравіі і прынашэнне ў ахвяру жывёлы.

— Свяшчэнныя мясціны наведваюць не проста, каб іх убачыць, — расказаў «Звяздзе» муфтый Мусульманскага рэлігійнага аб'яднання Рэспублікі Беларусь Абу-Бекір Шабановіч, старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання татар «Зікр уль-Кітаб» («Памяць і кніга»). — Людзі падчас хаджу моляцца, каб ачысціць сябе ад грахоў, падзякаваць Усявышняму і папрасіць аб дапамозе ў добрых справах, у падтрымцы міру, сяброўства, узаемаразумення не толькі ў сем'ях мусульман, вернікаў, але з усімі, хто жыве побач, нягледзячы ні на сацыяльнае становішча, ні на рэлігійную прыналежнасць.

Шматдзённае паломніцтва завяршаецца ахвярапрынашэннем жывёлы. Курбан-Байрам лічыцца адным з галоўных святаў мусульманскага календара, яно пачынаецца асаблівай малітвай і доўжыцца чатыры дні. У 20 мусульманскіх абшчынах Беларусі сёння будуць прынесены ў ахвяру курбаны — спецыяльна для гэтай мэты прыгатаваныя жывёлы: быкі і бараны. — Для нас вельмі важны не толькі гэты рытуал, — патлумачыў муфтый Абу-Бекір. — Важна радавацца адзін аднаго, віталь, дапамагаць адзін аднаму, садзейнічаць еднасці грамадства. Я маю на ўвазе не адных мусульман, а ўсіх, хто жыве ў Беларусі. Гэта свята з ліку тых, якія садзейнічаюць аб'яднанню людзей, яно носіць станоўчы зарад. Жадаю спакою, шчасця, дабрабыту ўсім народам, якія жывуць на гэтай зямлі!

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»**

**ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОБРАЩЕННЫХ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ:**

| № Лота | Наименование объекта | Адрес объекта | Общ. пл. (кв.м) | Начальная цена, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Гальванический цех | Борисовский р-н, д. Лошница | 712 | 209 850 402 |
| 2 | Ангар металлический | г. Борисов, ул. Ибаррури, 9 | 372,5 | 39 016 338 |
| 3 | Гаражный комплекс (боксы 1—6) | | 406,4 | 53 601 555 |

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.05.2007 г. Аукцион состоится 08.01.2008 г. в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 04.01.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327.**

**Сайт в Интернете: www.rlt.by** УНП 690324015.

ISSN 1990 - 763X

## Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 656

# Аб зацвярджэнні важнейшых параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2008 год

1. У мэтах забеспячэння ўстойлівага эканамічнага росту і павышэння ўзроўню жыцця насельніцтва зацвердзіць найважнейшыя параметры прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2008 год:

| | 2008 год у працэнтах да 2007 года (у супастаўных цэнах) |
|---|---|
| Валавы ўнутраны прадукт | 108—109 |
| Прадукцыя прамысловасці | 108—109 |
| Прадукцыя сельскай гаспадаркі | 107—108 |
| Інвестыцыі ў асноўны капітал | 115—117 |
| Вытворчасць спажывецкіх тавараў | 109—110 |
| у тым ліку: | |
| харчовых | 108—109 |
| нехарчовых | 110—111 |
| Аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі — усяго* | 114,5—115,5 |
| у тым ліку: | |
| экспарту | 116—117 |
| імпарту | 112,5—113,5 |
| сальда (млн долараў ЗША) | (-1400)—(-1420) |
| Рэальныя грашовыя даходы насельніцтва | 109—110 |
| Рознічны тавараабарот | 110—111 |
| Платныя паслугі насельніцтву | 109—110 |
| Прадукцыйнасць працы | 106,9—107,7 |
| Рэнтабельнасць рэалізаванай прадукцыі, работ і паслуг у прамысловасці (у працэнтах) | 12—13 |
| Энергаёмістасць валавога ўнутранага прадукту (зніжэнне ў працэнтах) | 7—8 |
| Увод у эксплуатацыю жылля за кошт усіх крыніц фінансавання (млн кв. метраў) | 4,7—5,2 |
| Колькасць занятых у эканоміцы (тыс. чалавек) | 4460—4535 |

**Па метадалогіі плацежнага балансу.*

2. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь:

сумесна з Нацыянальным банкам распрацаваць комплекс мераў па павышэнню эфектыўнасці эканомікі, дынамічнаму развіццю яе галін, стварэнню макраэканамічных умоў для актывізацыі інвестыцыйнай дзейнасці і на гэтай аснове забяспечыць дадатковы прырост валавога ўнутранага прадукту на 2 працэнтныя пункты ў параўнанні з узроўнем, прадугледжаным у пункце 1 гэтага Указа. У гэтых мэтах мабілізаваць рэспубліканскія органы дзяржаўнага кіравання, іншыя дзяржаўныя арганізацыі, падпарадкаваныя Ураду Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам на прыняцце абавязацельстваў па выкананні павышаных параметраў прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2008 год;

ва ўстаноўленым парадку давесці да рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, іншых дзяржаўных арганізацый, падпарадкаваных Ураду Рэспублікі Беларусь, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама заданні па рэалізацыі прагнозу сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2008 год;

пасля ўступлення ў сілу Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бюджэце Рэспублікі Беларусь на 2008 год»:

у месячны тэрмін зацвердзіць на 2008 год пералік рэспубліканскіх дзяржаўных патрэбаў, дзяржаўных заказчыкаў па пастаўках (закупках) тавараў (работ, паслуг) для гэтых патрэбаў, а таксама вызначыць адказных выканальнікаў і пастаўшчыкоў зыходзячы са складу названых патрэбаў;

у двухмесячны тэрмін прыняць неабходныя рашэнні, накіраваныя на дасягненне найважнейшых прагнозных параметраў;

на працягу 2008 года ажыццяўляць іншыя меры па выкананню гэтага Указа.

3. Гэты Указ уступае ў сілу з 1 студзеня 2008 г., за выключэннем абзаца трэцяга пункта 2 і гэтага пункта, якія ўступаюць у сілу з дня падпісання Указа.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**А. ЛУКАШЭНКА.**

*18 снежня 2007 г., г. Мінск.*

### Рэпарцёр атрымаў заданне

# ...Знайсці мясцовага мільянера

**Кожны чалавек мае права сёння адкрыць свой бізнэс — нешта вырабляць, аказваць паслугі, прадаваць. Гэта толькі трэба вітаць. Чалавек не толькі сам зарабляе грошы, але часта дае працу і іншым. Такіх дзелавых людзей патрэбна ведаць усім. Іх партрэты, як тых перадавікоў, варта, на маю думку, вешаць на Дошку Гонару. Але чамусьці яны хочуць трымацца ў цяні.**

Шмат даводзілася пісаць пра тых, хто рамантуе абутак, прышывае гузікі ці нешта вырошчвае на сваіх гектарах. Безумоўна, праца гэтых людзей вельмі патрэбная, але яны зарабляюць той мінімум, які дае магчымасць жыць на фоне іншых больш-менш бязбедна ды і ў іх працы няма рамантычнасці — штодзённая работа. І захацелася напісаць пра чалавека, які мае салідны бізнэс і жыве на «шырокую нагу» — мае катэдж у некалькі паверхаў, дарагі аўтамабіль, адным словам, усе радасці жыцця.

Вунь увесь свет ведае расійскіх мільярдэраў: Абрамовіча, Патаніна, Прохарава... ды іх усіх не пералічыць. І якімі яны справамі варочаюць! А ў нас нібыта і багатых людзей няма. Хоць у кожным райцэнтры ёсць фірмы, прыватнікі, прадпрымальнікі, а пра буйныя гарады і гаварыць не даводзіцца. Надумаў сустрэцца з дырэктарам аднаго саліднага магазіна. Нічога асаблівага не хацеў. Магазін буйны ў цэнтры горада, хацелася пагаварыць аб праблемах, калектыве, працы... Жанчына выслухала і паабяцала перазваніць. Знаёмы прыём — вядома ж, не патэлефанавала. А праз тыдзень зазірнуў да яе ў кабінет. Але як увайшоў, так і выйшаў — размовы не атрымалася. І тады вырашыў пра рэгіянальных мільярдэраў даведацца ў падатковай інспекцыі. Думалася, што дзе-дзе, а там пра ўсіх багатых і дзелавых усё ведаюць. Прозвішчы багатых людзей мне ніхто не назваў, хоць начальнік Баранавіцкай падатковай інспекцыі Васіль Сухаверхі і сказаў:

— У нас Абрамовічаў няма, а вось Карэйкі ёсць.

Мне заставалася толькі знайсці тых мільянераў. Сустрэча з гаспадаром буйной фірмы па вырабе мэблі паказала, што наш чалавек — вялікі майстра ўхіляцца ад канкрэтнага пытання.

— Ведаеце, якія даводзіцца плаціць падаткі, — уздыхнуў суразмоўца і пачаў тыя падаткі пералічваць, — а яшчэ трэба зарплату людзям выплачваць, закупляць матэрыялы, абсталяванне зношваецца... і грошы ў жонкі прасіць даводзіцца.

Можна было падумаць, што ўвесь гэты бізнэс як хамут на шыі. Але разам з тым ездзіць чалавек на новым джыпе «мерседэс» і ў раздзел бедных ніяк не трапляе. Неяк удалося пагаварыць з прадпрымальнікам, які адпачываў на экватары.

— Мае суседзі не ведаюць, дзе я быў. І мне рэклама не патрэбная, — сказаў мужчына.

А тое, што ў нас ёсць багатыя людзі, то тут сумнення няма. Калі прыватнік укладвае ў малочны завод паўтара мільёна долараў, то гэта значыць, што грошы ў чалавека ёсць, і немалыя. І тое, што ў краіне з'явілася праслойка багатых, якія могуць грошы зарабіць, то грамадства ад гэтага не прайграе. На жаль, яны стараюцца быць непрыкметнымі і нават імкнуцца прыкінуцца беднымі.

Вось у прыватных руках свінакомплекс на пяць тысяч галоў — круцяцца вялікія грошы, у гаспадара хапала ўмення і хваткі адрадзіць комплекс, паставіць выпуск свініны на паток. Хваліць трэба чалавека, а ён пачынае хныкаць, як цяжка жывецца і гэта замест таго, каб расказаць, як удалося адрадзіць тут жыццё.

Усё шчыра і па закону, то чаго туліцца і ўцягваць галаву ў плечы?

І ўсё ж ад аднаго дырэктара прыватнага прадпрыемства давялося пачуць:

— Я чалавек багаты і магу ў любы момант з рахунка зняць патрэбную суму.

Але гэта сказаў не беларус, а балгарын, які ўзяў у арэнду адно наша прадпрыемства і здолеў «раскруціць» яго. Між іншым, ён не скардзіўся на эканамічныя ўмовы, а хваліў мясцовую ўладу, якая не перашкаджае яму працаваць. Цяпер я разумею — мільянер Карэйка з «Залатога цяляці» Ільфа і Пятрова быў беларусам. І каб знайсці нашага чалавека з мільёнам долараў, неабходна быць Астапам Бэндарам.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**

# ЮБІЛЕЙНАЯ ДАТА ЗАКРЫТАЙ СЛУЖБЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нарэшце, аб тым, як стаць супрацоўнікам органаў дзяржбяспекі, старшыня камітэта паведаміў аб педантычным, прынцыповым адборы кадраў для праходжання службы ў камітэце: «Мы праціўнікі таго, каб нехта выходзіў з уласнай падобнай ініцыятывай, самі шукаем тых людзей, якія, на наш погляд, дазволяць чалавеку працаваць з дастатковай эфектыўнасцю. Гэта павінен быць чалавек, які прайшоў армейскую школу, атрымаў вышэйшую адукацыю, мае вопыт работы ў грамадзянскім жыцці і патрэбны нам. Калі такі чалавек мае жаданне працягнуць працоўную дзейнасць у органах дзяржбяспекі, значыць, пасля праходжання пэўных тэставых іспытаў ён становіцца слухачом Інстытута нацыянальнай бяспекі, атрымлівае на працягу 2 гадоў другую вышэйшую спецыяльную адукацыю і толькі пасля гэтага залічваецца ў падраздзяленне, прыступае да выканання сваіх службовых абавязкаў. Павінен падкрэсліць, што мы не выпрабоўвалі і не выпрабоўваем ахвотных працаваць у нас...».

Дарэчы, адносна гістарычнага мінулага органаў дзяржбяспекі Юрый Жадобін кажа, што ні забыць, ні перапісаць мінулае нельга. Колішнія супрацоўнікі КДБ — гэта частка народа, тыя людзі, якія выконвалі тагачасныя заказы грамадства і перажылі не меншыя страты, чым сам народ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## РАСЦЕ СЯРЭДНЯЯ ПРАЦЯГЛАСЦЬ ЖЫЦЦЯ

**Сёння ў Мінску пражывае 1 мільён 809 тысяч чалавек. З 2006 года назіраецца натуральны прырост насельніцтва. За дзесяць месяцаў гэтага года нарадзілася 16 тысяч, а памерла 14 тысяч чалавек.**

З 22—24 да 24—26 гадоў павялічыўся сярэдні ўзрост тых, хто бярэ шлюб і з 23 да 25 гадоў павялічыўся ўзрост жанчын, якія нараджаюць першае дзіця.

Хоць на сто дзяўчынак нараджаецца 109 хлопчыкаў, мужчынская смяротнасць перавышае жаночую. У выніку чаго ў Мінску на 1000 мужчын прыпадае 1160 жанчын. З 82 працэнтаў у 2005 годзе да 84 у 2006-м узрасла доля дзяцей, якія нарадзіліся ў шлюбе. А сярэдняя працягласць жыцця ў сталіцы ў мінулым годзе дасягнула найбольш высокага за ўсю гісторыю ўзроўню — 72 гады, прычым у жанчын гэты паказчык роўны 77 гадам, у мужчын — 67.

**«Мінск-Навіны».**

# Пры правядзенні капрамонту рэканструюемага дома можна будзе праводзіць надбудову памяшканняў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 657 «Аб некаторых пытаннях рэканструкцыі жылых дамоў».

Указам прадугледжваецца магчымасць надбудовы жылых (нежылых) памяшканняў пры правядзенні капітальнага рамонту рэканструюемага дома і прапануецца схема дзеянняў заказчыкаў (забудоўшчыкаў) і мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў пры мансардным будаўніцтве жылля (далей — надбудова памяшканняў).

Надбудова адпаведных сучаснаму якаснаму стандарту памяшканняў у існуючых дамах з'яўляецца адным з напрамкаў ушчыльнення гарадской забудовы і атрымання дадатковых плошчаў. Разам з тым, пры надбудове памяшканняў значна паляпшаецца як знешні выгляд асобнага будынка, так і архітэктурны ансамбль забудовы горада ў цэлым. Пры вырашэнні пытання аб мэтазгоднасці надбудовы памяшканняў улічваюцца ў асноўным горадабудаўнічыя і эканамічныя фактары.

У выніку мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы маюць магчымасць папоўніць бюджэт капітальнага рамонту жыллёвага фонду за кошт адлічэнняў інвестараў і іншых пералічэнняў у адпаведнасці з умовамі аўкцыёнаў, знізіць эксплуатацыйныя выдаткі на ўтрыманне даху, зменшыць энергастраты ў будынку, правесці рамонт або замену знадворных інжынерных сетак, а таксама павялічыць аб'ёмы ўводу новага жылля, знізіўшы пры гэтым сабекошт яго будаўніцтва.

Згодна з указам рэканструкцыя дома шляхам правядзення надбудовы ажыццяўляецца з пісьмовай згоды простай большасці ўласнікаў. Грамадзяне на перыяд рэканструкцыі іх дома вызваляюцца за часовыя нязручнасці пражывання ад плацяжоў за камунальныя паслугі да завяршэння такой рэканструкцыі, а адпаведныя затраты ўскладаюцца на заказчыкаў (забудоўшчыкаў).

Жыхары рэканструюемых дамоў атрымаюць пэўныя перавагі па паляпшэнні тэхнічнага стану дома і ўмоў пражывання ў ім. Так, з удзелам сродкаў інвестараў у гэтых дамах будуць выконвацца цеплавая мадэрнізацыя, праводзіцца рамонт (замена) унутрыдамавых інжынерных сістэм і бягучы рамонт дапаможных памяшканняў, фасадаў, добраўпарадкаванне прылеглай да дома тэрыторыі, замена аконных блокаў, добраўпарадкаванне лоджый, ліфтаў і іншае. Кошт кватэр у такім доме пасля яго рэканструкцыі павялічыцца на другасным рынку за кошт павышэння спажывецкіх якасцяў дома на 20—25 працэнтаў.

Пры надбудове жылых памяшканняў павышанай камфортнасці або нежылых памяшканняў заказчык (забудоўшчык) удзельнічае ў фінансаванні капітальнага рамонту існуючай часткі жылога дома ў памеры, які вызначаецца гарадскімі (раённымі) выканаўчымі камітэтамі, а ў выпадку будаўніцтва жылых памяшканняў тыпавых спажывецкіх якасцяў доля ўдзелу забудоўшчыка (заказчыка) не будзе перасягаць 10 працэнтаў ад кошту капітальнага рамонту дома.

Акрамя таго, у адпаведнасці з Указам, права на ажыццяўленне надбудовы жылых памяшканняў тыпавых спажывецкіх якасцяў у доме, які падлягае рэканструкцыі, прадастаўляецца па рашэнню гарадскога (раённага) выканаўчага камітэта на бязвыплатнай аснове, а надбудовы жылых памяшканняў павышанай камфортнасці і (або) нежылых памяшканняў — па выніках аўкцыёну. Пераважнае права на ўдзел у долевым будаўніцтве надбудовы памяшканняў тыпавых спажывецкіх якасцяў маюць грамадзяне, якія пражываюць у рэканструюемым доме, і ў першую чаргу тыя, хто стаіць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Унесены змяненні ў Палажэнне аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Беларусі

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 655 «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Палажэнне аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь».

Як паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы, у дакументе ўдакладняецца, што рашэнні прэзідыума ВАК прымаюцца ў форме пастановы. Уводзіцца правіла аб абавязковай матывіроўцы рашэння прэзідыума ВАК па апеляцыях суіскальнікаў, што накіравана на забеспячэнне іх правоў і ліквідацыю падставы для абскарджання такіх рашэнняў прэзідыума ВАК Прэзідэнту Беларусі.

Згодна з указам патрабаванні, якія прад'яўляюцца да суіскальніка вучонай ступені кандыдата навук, прыводзяцца ў адпаведнасць з падпісаным кіраўніком дзяржавы Законам Рэспублікі Беларусь ад 11 ліпеня 2007 года «Аб вышэйшай адукацыі». Упарадкуецца таксама рашэнне пытання аб абароне беларускімі грамадзянамі дысертацыі ў замежнай дзяржаве. Такая абарона павінна прайсці папярэдняе ўзгадненне з ВАК. Уносяцца і іншыя змяненні і дапаўненні, якія маюць пераважна рэдакцыйны або ўдакладняльны характар.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# ПЕРШЫ БАНК БЕЛАРУСІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Нават калі глядзець у недалёкае мінулае, параўнаць час сённяшні і колішні, калі ўстанова спраўляла васьмідзесяцігадовы юбілей, сукупныя яе актывы выраслі за пяць гадоў у пяць разоў. Распавядае **намеснік старшыні праўлення ААТ «Ашчадны банк «Беларусбанк» Уладзімір НОВІК**:

— На сёння сукупныя актывы нашага банка складаюць больш за 7 мільярдаў долараў. Значна павялічылася і рэсурсная база, мы сталі прыкметнымі на знешнім рынку, па аперацыях на якіх займаем першае месца сярод беларускіх банкаў. Мы з'яўляемся і самым буйным крэдыторам рэальнага сектара эканомікі. Крэдытны партфель банка складае 13 трыльёнаў рублёў, што ў дваццаць разоў вышэй, чым у пачатку 2001 года.

Напрыклад, сур'ёзны кліент можа разлічваць на атрыманне крэдыту ў памеры да 250 мільёнаў долараў. Больш ні адзін банк у краіне не здольны «пазычыць» пад працэнты такі вялікі аб'ём сродкаў. Нездарма міжнароднае рэйтынгавае агенцтва «Moody's Investors Service» прысвоіла ўстанове рэйтынг устойлівасці E+, доўгатэрміновы рэйтынг Ba1 і кароткатэрміновы Not Prime для дэпазітаў у нацыянальнай валюце, B2 і Not Prime для дэпазітаў у замежнай валюце. Міжнароднае рэйтынгавае агенцтва Fitch Ratings павысіла доўгатэрміновы рэйтынг з узроўню «CCC+» да «B-», і кароткатэрміновы з узроўню «C» да «B». Гэтыя рэйтынгі, паводле міжнароднай класіфікацыі, сведчаць аб устойлівым развіцці банка.

Слова даверу застаецца і за ўкладчыкамі банка. ААТ «ААБ Беларусбанк» тут роўных няма. Аб даверы людзей да «свайго» банка сведчыць, напрыклад, хоць бы той факт, што з 2001 года аб'ём прыцягнутых сродкаў фізічных асобаў вырас у трыццаць разоў, да 6,2 трыльёнаў рублёў.

— Найбольш запатрабаванымі сталі крэдыты на спажывецкія патрэбы, для набыцця нерухомасці, для вучобы і адпачынку, у апошнія час — аўтамабільныя крэдыты, — падкрэсліў Уладзімір НОВІК. — Акрамя крэдытаў, мы прапануем сістэму будаўнічых зберажэнняў і аблігацыі. У будучым чалавек зможа працаваць са сваім рахункам, знаходзячыся ў любым пункце свету. Мы імкнёмся, каб кліент усё менш наведваў офіс нашага банка і эканоміў свой час.

Яшчэ адна прыемная навіна — будзе пашырана сістэма банкаматаў і тэрміналаў аплаты за камунальныя паслугі. Пасля наведвання пэўнай электроннай старонкі пад назвай «калькулятар крэдыту» і адказу на смешчаныя на ёй пытанні, камп'ютар сам падлічвае і дае адказ, на які ліміт крэдыту карыстальнік можа разлічваць.

Свае ўкладанні банку даверылі больш за 60 працэнтаў людзей, якія жывуць у нашай краіне.

Летась установа атрымала ўзнагароду «Банк года Беларусі». Таварыства пачало ўжо, і на працягу двух гадоў скончыць падрыхтоўку да першапачатковага размяшчэння акцый (IPO) на Лонданскай фондавай біржы — адным з цэнтраў гандлю каштоўнымі паперамі вядучых кампаній сусвету.

— Гэта патрабуе ад нас засвавання міжнародных стандартаў, — працягвае Уладзімір Новік. — Публічнае размяшчэнне каштоўных папер — сур'ёзны і адказны крок.

Банк ужо мае свае прадстаўніцтвы ў Кітаі, Расіі, Польшчы, Германіі, зараз з'явіцца яшчэ адно, у сталіцы Вялікабрытаніі. Поспехі заўважальныя за мяжой, і таму да банка прыглядаюцца замежныя інвестары.

— Так, да нас звяртаюцца з рэальнымі прапановамі аб набыцці часткі акцый нашага банка ААТ «ААБ Беларусбанк» падрыхтаваны да супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі, і для нас няма розніцы, з заходняга ці ўсходняга рэгіёна свету яны да нас звяртаюцца. У нас ёсць пэўныя патрабаванні — акрамя грашовай долі, магчымы партнёр павінен прадстаўляць вопытны, аўтарытэтны ў свеце фінансавы інстытут, мець самыя сучасныя банкаўскія тэхналогіі і вопытны менеджмент, — узгадаў Уладзімір Уладзіміравіч. — А ўвогуле, канчатковае рашэнне аб продажы часткі акцый нашага банка заўсёды застаецца за яго ўласнікам — дзяржавай.

На сёння банк мае больш за дзве тысячы сваіх падраздзяленняў, геаграфія дзелавога супрацоўніцтва перавышае 30 краін. Зараз ён фінансуе больш за дзевяноста інвестыцыйных праектаў. За адзінаццаць гадоў дзякуючы крэдытнай падтрымцы банка ў эксплуатацыю былі ўведзены 2400 шматкватэрных дамоў, больш за 170 тысяч чалавек палепшылі свае жыллёвыя ўмовы.

Грошы застануцца толькі фінансавымі сродкамі, галоўны ж капітал — заўсёды людзі. Менавіта дзякуючы розуму, ідэям, энергіі і працавітасці работнікаў ААТ «ААБ Беларусбанк» ён дасягнуў сваёй вяршыні. У дзень святкавання юбілею ў Палацы Рэспублікі, старшыня Праўлення Адкрытага акцыянернага таварыства «Ашчадны банк «Беларусбанк» Надзея Ермакова выказала сардэчную падзяку сваім работнікам, усім людзям, якія дапамагалі станаўленню і развіццю банка. Заработную плату праз банк атрымлівае кожны другі працуючы, пенсію — кожны пяты пенсіянер. Большасць пластыкавых картак таксама належыць ААТ «ААБ Беларусбанк». У гонар юбілею калектыву гэтай установы быў уручаны Прывітальны адрас і Падзяка кіраўніка дзяржавы, гучалі вітальныя словы ад Адміністрацыі Прэзідэнта, работнікі ўстановы атрымалі Ганаровыя граматы Савета Міністраў і Нацыянальнага сходу, Нацыянальнага банка і Міністэрства фінансаў.

**Дзмітрый АЛЬФЕР.**

## ЗАТ «РРБ-БАНК» АТРЫМАЎ 3 МЛН USD ДЛЯ КРЭДЫТАВАННЯ МАЛОГА І СЯРЭДНЯГА БІЗНЭСУ

**ЗАТ «Акцыянерны банк рэканверсіі і развіцця» стаў чацвёртым фінансавым банкам-партнёрам Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР).**

Па распрацаваным праекце ЕБРР выдзеліў прыватнаму беларускаму банку крэдытную лінію ў памеры 3 мільёнаў долараў ЗША тэрмінам на 5 гадоў. Гэтыя сродкі будуць накіраваны на крэдытаванне ў нашай краіне мікра- і малога бізнэсу ў памеры да 100 тысяч USD і на выдачу субкрэдытаў для сярэдняга бізнэсу ў памеры да 500 тысяч долараў. У выніку перамоў бакі дзвюх банкаўскіх устаноў дамовіліся, што для ўзмацнення пазіцый і далейшага развіцця паслуг па мікрафінансаванні прыватнага сектара эканомікі Беларусі, ЗАТ «РРБ-Банк» будзе аказвацца тэхнічная дапамога па лініі праграмы «Цэнтральнаеўрапейская ініцыятыва».

**Сяргей КУРКАЧ.**

# Шэнгенская зона 21 снежня пашырыцца да граніц Беларусі

**Шэнгенская зона 21 снежня пашырыцца да граніц Беларусі: Польшча, Літва, Латвія, а таксама Эстонія, Чэхія, Венгрыя, Славакія, Славенія і Мальта ўвойдуць у прастору без кантролю ў межах унутраных граніц.**

Цяпер дзяржавамі — членамі Шэнгенскага пагаднення з'яўляюцца Аўстрыя, Бельгія, Данія, Фінляндыя, Францыя, Германія, Ісландыя, Італія, Грэцыя, Люксембург, Нідэрланды, Нарвегія, Партугалія, Іспанія і Швецыя. Кантроль на сухапутных і марскіх унутраных граніцах у межах павялічанай Шэнгенскай зоны будзе спынены з 21 снежня, на паветраных — з 30 сакавіка 2008 года. Як растлумачылі карэспандэнту **БЕЛТА** ў Еўрапейскай камісіі ў Бруселі, шэнгенская віза, выдадзеная дыпламатычным прадстаўніцтвам адной з гэтых краін, дзейнічае ва ўсіх дзяржавах-членах. Пасольствы краін, якія ўступаюць у Шэнген, пачнуць выдаваць шэнгенскія візы з 21 снежня. Пералік неабходных дакументаў і ўмовы выдачы будуць адпавядаць агульнапрынятым ва ўсіх дзяржавах-членах правілам.

Грамадзяне трэціх краін, у тым ліку Беларусі, павінны звяртацца ў консульскую ўстанову той краіны — удзельніцы Шэнгенскага пагаднення, дзе яны маюць намер правесці найбольш часу. Калі ж тэрміны знаходжання ў некалькіх дзяржавах прыкладна аднолькавыя, дакумент трэба падаваць у пасольства краіны, граніцу якой грамадзянін перасячэ першай. Пры наяўнасці шэнгенскай візы грамадзяне Беларусі могуць перамяшчацца ў межах усёй Шэнгенскай зоны, уключаючы новыя краіны-члены.

Кошт шэнгенскай візы для грамадзян Беларусі складае 60 еўра. У індывідуальных выпадках памер абавязковага збору можа быць зменшаны або адменены ў адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам, калі гэта накіравана на развіццё культурнага і гуманітарнага супрацоўніцтва, садзейнічанне інтарэсам у галіне знешняй палітыкі і іншых жыццёва-важных сферах. Ад платы за шэнгенскую візу, як правіла, вызваляюцца дзеці да 6 гадоў, школьнікі, студэнты, аспіранты і выкладчыкі, што іх суправаджаюць, якія ажыццяўляюць паездкі з мэтай навучання і адукацыйных трэнінгаў, а таксама спецыялісты, якія накіроўваюцца ў Еўрасаюз з мэтай навуковых даследаванняў. Бясплатна выдаецца таксама віза, калі грамадзянін Беларусі з'яўляецца членам сям'і грамадзяніна Еўрасаюза або краіны — удзельніцы Еўрапейскага эканамічнага супольніцтва.

У Еўракамісіі падкрэслілі, што нацыянальныя візы, якія выдаюцца ў пасольствах новых дзяржаў — удзельніц Шэнгенскага пагаднення, дзейнічаюць толькі на тэрыторыі краіны, што выдала дазвол на ўезд. Аднак у так званы пераходны перыяд (да 21 чэрвеня 2008 года) пры наяўнасці такой візы можна будзе транзітам перасякаць тэрыторыю іншых краін-членаў, што далучыліся да Шэнгена, выключаючы Эстонію і Літву.

Адказваючы на пытанне аб маючым адбыцца ўвядзенні біяметрычных візаў, у ЕК паведамілі, што інфармацыйная сістэма, у якой павінны захоўвацца біяметрычныя даныя грамадзян, яшчэ не пачала функцыянаваць. Стварэнне неабходнай юрыдычнай асновы запланавана на пачатак 2008 года. Пасля гэтага сістэма будзе ўводзіцца ў дзяржавах — членах Шэнгена, а затым — у дыпламатычных прадстаўніцтвах у трэціх краінах. (Пасольства Францыі ў Беларусі ўвяло сістэму выдачы біяметрычных візаў у якасці пілотнага праекта. Біяметрычныя візы ў Мінску выдае таксама дыпламатычнае прадстаўніцтва Вялікабрытаніі, але гэта краіна не ўваходзіць у Шэнгенскую зону і не прытрымліваецца правілаў выдачы шэнгенскіх візаў).

## КРЭДЫТ ДЛЯ «ПРІОРБАНК» ААТ

«Пріорбанк» ААТ заключыў крэдытнае пагадненне з Еўрапейскім банкам рэканструкцыі і развіцця на суму 20 млн долараў тэрмінам на 4 гады. Крэдыт будзе скіраваны на фінансаванне мікра-прадпрыемстваў і прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнэсу. Паводле слоў старшыні праўлення «Пріорбанк» ААТ Сяргея КАСЦЮЧЭНКІ, зараз назіраецца значная патрэба ў крэдытных рэсурсах з боку такіх прадпрыемстваў. Указаны сектар мае велізарны патэнцыял для развіцця. Па гэтай прычыне вылучаная сума была павялічана акурат удвая.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## Спорт-тайм

### Арцём Радзькоў — у «Хімках»

**22-гадовы абаронца барысаўскага БАТЭ і нацыянальнай зборнай Беларусі Арцём Радзькоў падпісаў трохгадовы кантракт з падмаскоўнымі «Хімкамі», якія выступаюць у прэм'ер-лізе чэмпіянату Расіі.**

Нагадаем, што на мінулым тыдні таксама трохгадовы кантракт з камандай Славалюба Мусліма падпісаў яшчэ адзін абаронца беларускай зборнай і салігорскага «Шахцёра» Павел Пласконны. Акрамя таго, «Хімкі» былі зацікаўленыя ў паслугах экс-абаронцы зборнай Беларусі Сяргея Гурэнкі, аднак ён аддаў перавагу маскоўскаму «Лакаматыву».

### За паўкрока...

Маладзёжная зборная Беларусі па хакеі (узрост ігракоў да 20 гадоў) не змагла атрымаць пуцёўку ў вышэйшы дывізіён. На чэмпіянаце свету ў групе «В» першага дывізіёна, які праходзіў з 12 па 18 снежня ў Рызе, падапечныя Андрэя Расолькі занялі другое месца. У заключным матчы беларусы прайгралі гаспадарам турніру латвійцам з лікам 1:3, якія і занялі першае месца ў групе і выйшлі ў вышэйшы дывізіён.

# Спіс стыпендыятаў павялічыўся

**Прэзідэнцкі спартыўны клуб узнагародзіў тых, хто даказаў, што Беларусь — спартыўная краіна**

Учора ў Мінску адбылося ўрачыстае ўручэнне імянных пасведчанняў маладым перспектыўным беларускім спартсменам і паралімпійцам, выдатным трэнерам. У наступным годзе яны будуць атрымліваць стыпендыі ад Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Хоць у параўнанні з 2007-м крытэрыі адбору сталі больш жорсткімі, колькасць стыпендыятаў павялічылася ажно на 20 чалавек: матэрыяльнае заахвочванне будзе выплачвацца са студзеня наступнага года 123 атлетам і настаўнікам, якія прадстаўляюць 27 відаў спорту (з іх 23 алімпійскія). Сярод іх — тэнісіст Уладзімір Ігнацік, «мастачка» Настасся Іванькова, баскетбалістка Настасся Верамеенка, гімнастка Настасся Марачкоўская, плывец Віктар Вабішчэвіч, цяжкаатлетка Кацярына Шкуратава і іншыя.

Фота Вольгі ЛАСКІ.

— Сваімі высокімі вынікамі вы нагадалі, што Беларусь — спартыўная краіна, — канстатаваў Дзмітрый Лукашэнка, старшыня цэнтральнага савета РДГА «Прэзідэнцкі спартыўны клуб». — З кастрычніка 2006 года па лістапад 2007-га нашы стыпендыяты ўзялі ўдзел у больш чым 120 афіцыйных міжнародных спаборніцтвах і заваявалі больш за 90 узнагарод, у тым ліку 36 — найвышэйшай якасці. Спадзяёмся, што стыпендыяты клуба змогуць заявіць аб сабе і ў наступным годзе на буйных міжнародных турнірах і Алімпійскіх гульнях. Зычым поспеху, шчырай барацьбы і яркіх перамог у гонар нашай краіны.

Намеснік міністра спорту і турызму Беларусі Дзмітрый Шычко перакананы, што падтрымка маладых спартсменаў з'яўляецца вялікім стымулам як для саміх атлетаў, так і для развіцця беларускага спорту ў цэлым. «Увага, якая надаецца рэзерву зборнай з боку кіраўніцтва краіны, прыносіць карысць. Калі летась беларусы заваявалі 401 медаль, то сёлета ўжо 512».

«У 2010 годзе нашы спартсмены возьмуць удзел у першых юнацкіх Алімпійскіх гульнях, — нагадаў віцэ-прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта Генадзь Аляксеенка. — Заахвочванне ў якасці стыпендый стане добрым штуршком для падрыхтоўкі да гэтых спаборніцтваў».

Ад імя ўсіх ветэранаў беларускага спорту алімпійскі чэмпіён па фехтаванні Аляксандр Раманькоў пажадаў маладому пакаленню раскрыць свой талент: «На нашай алімпійскай лаўцы месца хопіць усім. Змагайцеся і перамагайце! Мы ў вас верым».

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Прэзідэнцкі спартыўны клуб НАК, Міністэрства спорту і турызму, БФСТ «Дынама»

**Ірына ПРЫМАК.**

**РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» проводит аукцион по продаже объектов недвижимости**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ на открытом аукционе по продаже объектов республиканской собственности 28 декабря 2007 г.

| № п/п | Наименование объекта (местонахождение объекта, общая площадь (кв. м) | Начальная цена продажи объекта (руб.) | Сумма задатка (руб.) | Площадь отчуждаемого участка (га) | Форма проведения торгов |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1. | Здание гаража (инв. № 91), здание склада (инв. № 92), здание склада ГСМ (инв. № 93), здание конторы (инв. № 94), здание заправки ГСМ (инв. № 96), кабельные линии электропередач ААБ-1 3х120 (инв. № 108), асфальтобетонное покрытие (инв. № 109), цементобетонное покрытие (инв. № 110), ограждение из колючей проволоки (инв. № 111), ворота металлические (инв. № 112), в/г № 78, г. Витебск, ул. 1-я Заречная, 2Б, 795,4 кв. м. | 154 000 000 | 15 400 000 | 1,1886 | Открытый аукцион |
| 2. | Здание контрольно-технического пункта, в т.ч. мастерские (инв. № 5/306) с асфальтовым мощением (инв. № 306), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск, 2 этажа; 177,0 кв. м. | 74 000 000 | 7 400 000 | 0,0386 | Открытый аукцион |
| 3. | Здание неотапливаемого гаража (инв. № 5/305) с асфальтовым мощением (инв. № 305), в/г № 5 «Авиагородок», г. Бобруйск, 1196,0 кв. м. | 142 000 000 | 14 200 000 | 0,2692 | Открытый аукцион |
| 4. | Здание овощехранилища с крыльцами (инв. № 65/7) с ограждением из колючей проволоки (инв. № Д) — 21,6 м, в/г № 65 «Солнечный», г. Гомель, ул. Речицкое шоссе, 91а, 51,0 кв. м. | 6 500 000 | 650 000 | 0,0889 | Открытый аукцион с условиями* |
| 5. | Здание поликлиники (инв. № 1/39) с асфальтовым мощением (инв. № 39) — 42 кв. м, внутридворовой водопроводной сетью (инв. № В3) — 73,6 м, квартальными канализационными сетями (инв. №№ К1, К2) — 153,85 м, кабельными лини

## Кватэрнае пытанне

# Чэкі можна падарыць

***У нас з мужам свой дом. У ім, апроч нас, жывуць дзве дачкі. Адна — з дзецьмі, другая пакуль незамужняя. Ёй, уклаўшы чэкі «Жыллё», мы хацелі пабудаваць асобную кватэру. Але ў чаргу на будаўніцтва дачку не бяруць (хапае метраў). Што ў такім выпадку рабіць з чэкамі?***

**Л. ГЕРАСЮК,** *г. Слоним.*

Тымі, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, згодна з пунктам 3 Палажэння аб парадку ўліку грамадзян, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, прадастаўлення жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду (зацверджана Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 29 лістапада 2005 г. № 565) прызнаюцца, у прыватнасці, грамадзяне: якія не маюць ва ўласнасці ці ў карыстанні жылых памяшканняў у дадзеным населеным пункце; забяспечаныя агульнай плошчай жылога памяшкання менш за 15 кв. метраў на аднаго чалавека. Пры гэтым забяспечанасць агульнай плошчай жылога памяшкання вызначаецца выходзячы з сумы агульнай плошчы ўсіх жылых памяшканняў, што знаходзяцца ў дадзеным населеным пункце ва ўласнасці або ў карыстанні грамадзяніна і членаў яго сям'і, з якімі ён прымаецца на ўлік тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў; якія пражываюць у агульным памяшканні, прызнаным не адпавядаючым санітарным і тэхнічным патрабаванням, якія прад'яўляюцца да жылых памяшканняў; якія ўпершыню ўзялі шлюб (муж і жонка), калі ніводзін з іх не мае асобнай кватэры.

Такім чынам, калі незамужняя дачка аўтара пісьма ў рэдакцыю не мае законных падстаў для прызнання таго, што яна мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, то адмова ў пастаноўцы яе на кватэрны ўлік праамерны і яе канстытуцыйнае права на жыллё не парушана. Пры неабходнасці мець асобнае жыллё яна можа пабудаваць ці набыць яго за кошт уласных сродкаў, а таксама з выкарыстаннем банкаўскага крэдыту на агульных умовах. Што датычыцца чэкаў, то, па-першае, пасля 1 студзеня 2006 г. знаходзяцца ў абарачэнні і выкарыстоўваюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам толькі перарэгістраваныя чэкі «Жыллё». Асноўны накірунак іх выкарыстання — прыватызацыя займаемых жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду.

У выпадку немагчымасці (або адсутнасці такой неабходнасці) выкарыстання чэкаў «Жыллё» на прыватызацыю, яны перарэгістраваныя, могуць быць праіндэксаваны і выкарыстаны грамадзянамі і членамі іх сем'яў, якія стаяць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, для аплаты паявога ўзносу ў жыллёвым або жыллёва-будаўнічым кааператыве або пагашэння крэдыту (пазыкі), узятага на гэта будаўніцтва, фінансавання індывідуальнага або калектыўнага жыллёвага будаўніцтва, рэканструкцыю аднакватэрных, блакіраваных жылых дамоў, долевага ўдзелу ў жыллёвым будаўніцтве, набыцця жылля шляхам пакупкі, а таксама для пагашэння запазычанасці па крэдытах банкаў і пазыках юрыдычных асобаў, узятых і выкарыстаных на ўказаныя мэты.

Грамадзяне маюць права на індэксацыю чэкаў «Жыллё» як налічаных ва ўстаноўленым парадку непасрэдна ім, так і атрыманых у выніку дарэння ад мужа (жонкі), бацькоў, дзяцей, усыновіцеляў, усыноўленых, родных братоў і сясцёр, дзеда, бабкі, унукаў, атрыманых у спадчыну або па рашэнні суда, для пагашэння кошту будаўніцтва, рэканструкцыі або набыцця толькі аднаго жылога памяшкання.

У выпадку, калі ўласнік перарэгістраваных чэкаў «Жыллё» не мае патрэбы ў прыватызацыі займаемага жылога памяшкання (або яно не падлягае прыватызацыі), а таксама ў індэксацыі чэкаў (або не мае права на іх індэксацыю, паколькі не стаіць на ўліку тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў) для выкарыстання іх у вышэйпаказаных мэтах, то ён можа падарыць іх па натарыяльна засведчанаму дагавору вышэйпералічаным блізкім сваякам. Гэтыя сваякі, у сваю чаргу, могуць выкарыстаць падараныя чэкі «Жыллё» для прыватызацыі займаемых імі жылых памяшканняў у дамах дзяржаўнага жыллёвага фонду або для паляпшэння сваіх жыллёвых умоў (калі яны стаяць на законных падставах на кватэрным уліку).

**Віктар САВІЦКІ.**

## УНІВЕРСАЛЬНАЯ ПОШТА Факт

**У Гродзенскім філіяле РУП «Белтэлекам» адбылася прэзентацыя новай паслугі «Універсальная пошта».**

Сутнасць навінкі ў тым, што ў абанентаў «Белтэлекама» будзе магчымасць адкрыць універсальную паштовую скрынку для дастаўкі ўсіх відаў паведамленняў: SMS, электроннай пошты, факсімільных і галасавых. Акрамя захоўвання і доступу да рознай інфармацыі, «універсальная пошта» дазволіць кіраваць сваімі тэлефоннымі нумарамі, задаючы правілы, па якіх будзе адбывацца пераключэнне паміж імі. Да прыкладу, можна будзе стварыць правіла, па якім з 7 гадзін уваходныя званкі будуць накіроўвацца на хатні нумар, з 7 да 9 — на мабільны, а з 9 да 18 — на рабочы нумар.

Карыстальнікам гэтай паслугі атрыманая інфармацыя можа быць пераўтворана ў іншы выгляд, скажам, SMS прачытана голасам, а тэкставае паведамленне накіравана на факс. Атрымаць доступ да ўніверсальнай скрынкі дапаможа любая тэхналогія, якая ў гэту хвіліну «пад рукой» у абанента: можна скарыстацца камп'ютарам, стацыянарным альбо мабільным тэлефонам, факсам.

Работы па стварэнні пляцоўкі для аказання абанентам паслугі «ўніверсальная пошта» РУП «Белтэлекам» плануе завяршыць да канца гэтага года. Верагодна, што магчымасці новай сістэмы асабліва зацікавяць бізнэсменаў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

## За кім захаваныя льготы па аплаце кватэрнага тэлефона?

**З 17 снежня ўступіў у сілу Закон «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян». У сувязі з гэтым нашых чытачоў цікавіць, хто цяпер зможа карыстацца правам на 50-працэнтную скідку пры аплаце за тэлефон (у прыватнасці, ці былі пазбаўленыя такога права інваліды), за кім захавалася права на першачарговую ўстаноўку кватэрнага тэлефона.**

Як патлумачылі ў РУП «Белтэлекам», права на 50-працэнтную скідку за карыстанне кватэрным тэлефонам (акрамя аплаты за міжгароднія і міжнародныя размовы) прадастаўляецца: Героям Сацыялістычнай Працы (акрамя маючых права на бясплатнае карыстанне кватэрным тэлефонам), поўным кавалерам ордэна Працоўнай Славы; удзельнікам ВАВ; інвалідам вайны; асобам, якія бралі ўдзел у складзе спецыяльных фарміраванняў у размяніраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943—1945 гадах; асобы, узнагароджаныя ордэнамі і (ці) медалямі СССР за самаадданую працу і бясспрэчную воінскую службу ў тыле ў гады ВАВ; асобы, якія працавалі на аб'ектах проціпаветранай абароны, мясцовай проціпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх баз, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектаў у межах тылавых межаў дзеючых франтоў, на прыфрантавых участках чыгуначных і аўтамабільных дарог; члены экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрніраваныя ў пачатку ВАВ у портах іншых дзяржаў; асобы, якія працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях блакаднага Ленінграда і ўзнагароджаныя медалём «За абарону Ленінграда» і асобы, узнагароджаныя знакам «Жыхару блакаднага Леніграда»; непрацуючыя грамадзяне з кола ваеннаслужачых, асобаў кіруючага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, атрыманых пры выкананні абавязкаў воінскай службы (службовых абавязкаў); інваліды з дзяцінства ў выніку ранення, кантузіі, калецтва, звязаных з баявымі дзеяннямі ў час ВАВ або з наступствамі ваенных дзеянняў, якія дасягнулі ўзросту, што дае ім права на пенсію па ўзросце на агульных падставах.

Права на 50-працэнтную скідку будуць мець таксама інваліды з дзяцінства (мужчыны, якія дасягнулі 60 гадоў і жанчыны — 55 гадоў), якія або не маюць дзяцей ці маюць дзяцей, але пражываюць асобна ад сваіх дзяцей ці іншых сваякоў.

Права на першачарговую адназаровую бясплатную ўстаноўку кватэрнага тэлефона захавана за Героямі Беларусі, Героямі СССР, Героямі Сацыялістычнай Працы, поўнымі кавалерамі ордэнаў Айчыны, Славы, Працоўнай Славы; удзельнікамі і інвалідамі ВАВ; асобамі, якія бралі ўдзел у размяніраванні акупаваных тэрыторый; непрацуючымі з кола ваеннаслужачых, работнікаў органаў МУС, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў КДК Беларусі, якія сталі інвалідамі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворванняў, атрыманых пры выкананні воінскіх ці службовых абавязкаў.

Права на першачарговую аплатную ўстаноўку кватэрнага тэлефона прадастаўляецца ветэранам працы, Узброеных Сілаў, органаў унутраных спраў, пракуратуры, юстыцыі і судоў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.25 | 15.49 | 7.24 |
| Віцебск — | 8.22 | 15.31 | 7.09 |
| Магілёў — | 8.15 | 15.39 | 7.24 |
| Гомель — | 8.03 | 15.44 | 7.41 |
| Гродна — | 8.39 | 16.05 | 7.26 |
| Брэст — | 8.31 | 16.14 | 7.43 |

### Месяц

***Першая квадра 17 снежня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

### Імяніны

***Пр.*** *Амбросія, Антона, Івана, Міхаіла, Нікіфара, Ніла, Паўла, Сяргея;*

***К.*** *Багумілы, Дамінікая, Тэафіла, Яўгена.*

## НАДВОР'Е на заўтра

## ...у суседзяў

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ВАРШАВА | 0..+2°C | КІЕЎ | 0..+2°C | РЫГА | +3..+5°C |
| ВІЛЬНЮС | +2..+4°C | МАСКВА | -4..-2°C | С.-ПЕЦЯРБУРГ | +1..+3°C |

## Часопісу «Полымя» — 85!

# ФЛАГМАН АЙЧЫННАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Азіраючы далёкія дваццатыя гады мінулага стагоддзя, аналізуючы поступ віхурна-ідэйнага часу, болей і болей пагаджаешся з думкай, што само жыццё народа, які пракладваў гістарычны шлях да сваёй дзяржаўнасці, прагнула духоўнага азарэння — свайго «Полымя».**



Ужо сімвалічна тое, што менавіта ў снежні, калі сама прырода парошамі высцілае некрануты белавік, перад маладой айчыннай літаратурай, якая на хвалі рэвалюцыйнага абнаўлення свету пачула прыліў новых творчых сілаў, старонкамі народжанага часопіса высцілаўся некрануты чыставік будучыні і дзесяткі апантаных людзей, натхнёна і шчыра, часцей з фанатычнай верай у пафас пераломнага часу, рыхтуліся ствараць духоўную біяграфію народа.

Літаральна з першых нумароў літаратурна-мастацкі і грамадска-палітычны часопіс займеў шырокую папулярнасць сярод чытачоў. З прыхільнымі водгукамі ў яго адрас у тагачасным цэнтральным і рэспубліканскім друку выступілі вядомыя дзеячы нацыянальнай культуры. Так, у адной з маладнякоўскіх рэцэнзій за 1927 год адзначалася: «Ужо даўно перамагло «Полымя» ўсе перашкоды і стала галоўным рэгулярным часопісам беларускай культуры і палітыкі».

Многія стваральнікі «Полымя» — і тыя, хто рыхтаваў да выхаду ў свет яго першыя нумары, і тыя, хто ў бясконні начэй, чуючы жывы пульс нацыянальнага адраджэння, пісаў для часопіса баявітую публіцыстыку, паэзію і прозу — маладымі жыццямі паплаціліся за свой рамантычны парыў, бо ўжо рабіў першыя абароты махавік касцяломных рэпрэсій. Пайменна вядомы трагічны лёс як не ўсяго складу першай рэдкалегіі часопіса: Цішка Гартны, Міхась Чарот, Усевалад Ігнатоўскі... Асабліва ахвярна страшным для інтэлігенцыі Беларусі стаў 1930 год, калі па сфабрыкаванай справе СВБ («Саюза вызвалення Беларусі») было арыштавана 108 чалавек. Сярод іх акадэмікі Беларускай акадэміі навук Вацлаў Ластоўскі, Язэп Лёсік, Сцяпан Некрашэвіч, Гаўрыла Гарэцкі, прафесары Аркадзь Смоліч, Браніслаў Эпімах-Шыпіла, пісьменнікі Максім Гарэцкі, Уладзімір Дубоўка, Язэп Пушча, Адам Бабарэка, Язэп Дыла, Міхайла Грамыка, Алесь Гурло і іншыя.

Многія аўтары маладога «Полымя» абвінавачваліся ў тым, што ажыццяўлялі арганізаванае шкодніцтва на культурным, ідэалагічным і іншых участках сацыялістычнага будаўніцтва, праводзілі антысавецкую нацыяналістычную агітацыю, накіраваную на запаволенне тэмпаў развіцця Беларусі па сацыялістычным шляху, ставячы канчатковай мэтай адарванне Беларусі ў этнаграфічных межах ад Савецкага Саюза, стварэнне так званай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Трагічна склаўся лёс і першага афіцыйна прызначанага рэдактара часопіса, вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, празаіка Платона Галавача. Прызначаючы дзяржаўніка на гэту пасаду, ідэалагічныя службы як бы ўзмацнялі над часопісам неадступны кантроль, які выявіўся нават у тым, што часопіс пачаў называцца з 1932 года «Полымя рэвалюцыі». Раптоўнасць адхілення ў 1933 годзе Платона Рамановіча ад сумяшчальна занятай пасады дае падставы меркаваць, што з пастаўленай перад ім задачай ён справіўся не гэтак паспяхова, як таго хацелася тагачасным ідэолагам.

Нялёгкая ноша клопатаў легла на плечы наступнага палымяншага рэдактара Міхася Ціханавіча Лынькова. Нарастаў аб'яднаўчы працэс творчых сілаў. Уладам спатрэбілася своеасаблівая калектывізацыя літаратуры — стварацца Саюз савецкіх пісьменнікаў СССР і яго нацыянальныя падраздзяленні. Часопіс «Полымя» становіцца органам Саюза савецкіх пісьменнікаў БССР. Пачыналі тварыць «на карысць партыі» вядомыя майстры слова і пачаткоўцы. Літаратурная плынь станавілася афіцыйнай, з'яднанай з клопатамі партыі бальшавікоў — літаратура асвойвала метад сацыялістычнага рэалізму, вучылася быць народнай па змесце і партыйнай па форме, узносячы хваласпеў бацьку ўсіх народаў.

Аднак, нягледзячы на жорсткія рэпрэсіўныя ўмовы свайго існавання ў сумна вядомыя 30-я гады, з іх ахвярнай галгофаю 37-га, часопіс «Полымя» здолеў згуртаваць пад сваім сцягам нацыянальна свядомыя творчыя сілы, каму было наканавана стварыць нашу айчынную літаратуру, вартую шырокай грамадскай увагі, захапленне і гістарычнай перспектывы. Можна прыгадаць творчасць многіх волатаў роднага Слова, спелась мастацкай думкі якіх прыпадае на гэты ахвярны час. Але з асаблівай годнасцю хочацца падкрэсліць, што менавіта ў гэтыя трагічныя гады выпрабаванняў беларускага Духу энергетычна акумулюецца як не ўся творчая спадчына класіка беларускай прозы Кузьмы Чорнага, чые аповесці і раманы публікуюцца пад вокладкай «Полымя».

Сапраўдная літаратура жыве, спасцігаючы глыбіні чалавечай душы, нягледзячы на неймаверны ідэалагічны прэсінг. Не заняволіць, не падпарадкаваць яе ўзлёт дагматычнаму схематызму, не ўціснуць у межы партыйна зашораных пастулатаў. І нават у тых, хто падрыхтаваў для яе гільяціну, у пэўны момант уздрыгваюць рукі: і падрыхтаваныя ордэны на арышт класікаў нашай літаратуры мяняюцца імі на ордэны за заслугі...

Мы не павінны забываць сягоння, якой цаной аплачана нашымі папярэднікамі права на сумленную творчасць. Побач з ахвярамі сталіншчыны становяцца ў трагічны рад і палеглыя на палях Вялікай Айчыннай — не дасказалі сваё. Акрыяўшы ад панесеных страт, з падвоенай сілай загаварыла беларуская літаратура ў першыя пасляваенныя гады. Адроджанае «Полымя» адразу ж прадаставіла старонкі новым таленавітым творам. Пісьменнікі з ваенным вопытам задумваліся над жыццём народа ўсё больш бязлітасна праўдзіва. Схлынула хваля саладжавай хваласпеўнасці, тварылася мужная беларуская літаратура аб толькі што мінулай вайне.

Калі азіраю ў думках першы пасляваенны літаратурны прызыў — бачу іх усіх ацалелых, нямногіх. Бачу, як нядаўні франтавік у пераможанай Германіі, сабраўшы параскіданыя ад бамбёжак аркушы дабротнай трафейнай паперы, піша першую сваю аповесць — самую гуманную і чалавечную. Неўзабаве «Помста» Івана Шамякіна, дасланая ў зруйнаваны Мінск, будзе надрукаванай на старонках «Полымя». Потым, трымаючы ў руках гэты часопіс, уся Беларусь будзе зачытвацца ягонай «Глыбокай плынню». Свой «Мінскі напрамак» прапануе «Полымю» Іван Мележ.

Былыя ваенныя карэспандэнты, франтавікі і партызаны — аўтары «Полымя» — у прадымленых гімнасцёрках засталіся на вядомых нам здымках: сыходзіліся ахвотна ў рэдакцыйным пакойчыку, каб паведаміць адзін аднаму пра «сваю вайну», скіляліся над старонкамі рукапісаў, якім суджана было стаць летапісам народнае славы. Новыя вершы ўслых чыталі Максім Танк і Аркадзь Куляшоў, Пятро Глебка і Пятрусь Броўка — першы пасляваенны рэдактар часопіса, Пімен Панчанка і Анатоль Вялюгін...

Роздых пераможнага жыцця наталяў творчыя сілы. У неўладкаваных побытавых умовах — у цесных пакойчыках пры газніцах — нараджаліся тыя хрэстаматыйна вядомыя нам са школьнае парты творы, у якіх звонкагалоса крыляла сама пераможная радасць. Аднак спакваля ў яе шчыры задор былі ўплецены, як у вабную дзявочую касу, зырчастыя стужкі тэорыі бесканфліктнасці, згодна з якой лепшае ў жыцці павінна было канфліктаваць з крышачку горшым, калі ў пошуку героя стваральнай сучаснасці, ва ўгоду новым ідэалагічным патрэбам дня, адмаўляліся ад глыбіннага бачання саміх жыццёвых калізій. Хоць не дужа актыўна, аднак і «Полымя» грашыла перад сумленнем Літаратуры публікацыяй гэткіх твораў. І толькі «хрушчоўская адліга», развянчанне культу асобы Сталіна на гістарычным XX з'ездзе партыі, як ачышчальны вецер-свяжак, прынеслі на старонкі часопіса новую літаратурную хвалю. Яна асабліва па-мастацку спела выявіла сябе ў жанры рамана: шасцідзесятыя гады мінулага стагоддзя — сапраўдны раманны бум у беларускай літаратуры.

Адзін за адным з'яўляюцца ў свет «Людзі на балоце» І. Мележа, «Птушкі і гнёзды» Я. Брыля, «Сэрца на далоні» І. Шамякіна і многія іншыя творы. Вядуцца сур'ёзныя дыскусіі аб форме, змесце і мастацкіх магчымасцях раманнага жанру. Віруе сапраўдная літаратурная плынь жыцця, якая шліфуе, да стыльёвае зіхаты адточвае пісьменніцкае майстэрства многіх з тых, хто, адклаўшы зброю, зусім няподаўна ўзяўся за пяро. Суровыя ваенныя аповесці, застаючыся на дзесяткі гадоў верным пройдзеным франтавым дарогам і палеглым у баях сябрам, піша гродзенскі аўтар Васіль Быкаў. Магілёўскі паэт Аляксей Пысін па-філасофску глыбока асэнсоўвае перажытыя дні вайны ў шчымотна-журлівых вершах. Першыя крокі робіць у сур'ёзную літаратуру пакаленне дзяцей вайны, якому шчасліва выпадае цяпер стаць філалагічным — вучыцца літаратурнаму майстэрству на філалагічным і журналісцкім факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Вакол «Полымя» неўзабаве гуртуюцца тыя сілы беларускай літаратуры, якія забяспечаць ёй значны інтэлектуальны пад'ём, зведанне многіх раней невядомых формаў. Надыдуць палымянскія часы самага знакамітага рэдактара Максіма Танка, які потым, абраны старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі, здолее акрыліць усю нашу літаратуру на творчы росшук, рупліва будзе дбаць і пра тое, каб яна роўнай сярод роўных пачувалася ў свеце. Народзяцца дзесяткі адрасоў дружбы, беларускія пісьменнікі — духоўныя прадстаўнікі народа — стануць жаданымі гасцямі ў многіх краінах.

Як бы ні лямантавалі сягоння некаторыя пераацэншчыкі нашых духоўных каштоўнасцяў, што літаратура гэтага часу была цалкам сервільнай, аднак мала хто з сур'ёзных чытачоў пагодзіцца з імі, начытаўшыся ўдосталь сённяшніх «разняволеных» тэкстаў калялітаратурных дзялкоў.

Гэта на праву таленту і поту — наш залаты век, калі развінуліся літаральна ўсе літаратурныя жанры, калі мы, творчыя людзі, адчулі, што літаратурная праца — адна з пачэсных і адказных прафесій. Іншая справа, што і гэту прафесію, як і кожную чалавечую, дзяржава памкнулася скарыстаць у мэтах абвешчанага камуністычнага будаўніцтва. Рэдактары літаратурных выданняў інструктаваліся, а то і праходзілі працоўную ідэалагічную загартоўку ў аддзелах ЦК КПБ. Трывала ўсталёўваўся ўсёабдымны ГАЛОЎЛІТ.

У часы «жалезнай заслоны» літаратура выконвала ролю духоўнай повязі цывілізаванага свету. Творы, што на партыйную дазволенасць і чытацкі густ апрабоўваліся ў перыядычным друку, у тым ліку і ў «Полымі», пракладвалі дарогу і да сэрца чытачоў іншых народаў — праз нашу сумленную літаратуру расла цікавасць да Беларусі, якая ахвярна пацярпела ў гады фашысцкай навалы. Завязваліся цесныя творчыя і сяброўскія кантакты прызнаных беларускіх пісьменнікаў з сабратамі іншых літаратур. Масавымі тыражамі выдаваліся кнігі на рускай мове ў цэнтральных маскоўскіх выдавецтвах. Атрыбутамі літаратурнага жыцця станавіліся фестывалі і святы паэзіі, дні і тыдні літаратуры і розныя іншыя масавыя мерапрыемствы, заўсёднікамі і нязменнымі ўдзельнікамі якіх былі часцей за ўсё тыя пісьменнікі і паэты, якія сягоння так актыўна ратуюць, пэўна ад ідэалагічнага перакорму, за заходні тып дэмакратызацыі нашага грамадства, насаджэнне шкалы духоўных каштоўнасцяў замежнага кшталту, што абярнулася сусветным разгулам бульварна ходкай кніжнай прадукцыі і ўсё болей і болей з лёгкай рукі камерцыйных дзялкоў захлёствае і наш кніжны рынак.

У гэтыя гады «Полымя» становіцца своеасаблівым рупарам дружбы літаратур. На старонкі часопіса ў перакладах на беларускую мову прыходзяць творы вядомых пісьменнікаў — прадстаўнікоў геаграфічна блізкіх і далёкіх народаў. Творчыя кантакты з асаблівай сілай актывізуюцца ў постсавецкія гады, якія, трэба аддаць належнае часопісу, плённа паспрыялі ўваскрашэнню нашай нацыянальнай свядомасці, вяртанню гістарычнай памяці народа.

Несумненна, за парогам новага XXI стагоддзя сягонняшняя рэдакцыя часопіса застанецца вернай гэтым і многім іншым палымянскім традыцыям. Хочацца верыць, што беларуская літаратура нашага дзяржаўна стваральнага часу будзе гэткай жа гуманнай і сумленнай перад чытачом, не спакусіцца на танныя павевы літаратурнае моды, памятаючы, якім лікам ахвяраў адстоена ёю «права на песню». Многія нашы пісьменнікі, вярнуўшыся з палону палітычных прыхільнасцяў, урэшце ўспомняць пра тое, што падараваны ім небам талент павінен несці стваральную, а не разбуральную энергію. А маладыя, хто толькі ўступае ў вялікую літаратуру, своечасова засвояць урок: самавыяўленне — камп'ютарнае пляканне тэкстаў — яшчэ не ёсць сама літаратура.

Спадзяёмся, што і надалей з «Полымем» будуць супрацоўнічаць самыя сталыя майстры слова, што справа, якую мы дзейснім сумеснымі інтэлектуальнымі намаганнямі на карысць Бацькаўшчыны, будзе запатрабавана дзяржавай і клапатліва падтрымана ёю — нашы літаратурныя выданні прыйдуць ва ўсе куткі Беларусі, стануць носьбітамі нашых чалавечых каштоўнасцяў, духоўным арыенцірам сучаснага грамадскага жыцця.

**Мікола МЯТЛІЦКІ,**
**галоўны рэдактар часопіса «Полымя», лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Янкі Купалы.**

## Дзве даты

## 20 снежня

**1917 год** — па ініцыятыве Фелікса Дзяржынскага для барацьбы з контррэвалюцыяй і сабатажам створана Усерасійская надзвычайная камісія (ВЧК). У гэты ж дзень у 1920 годзе створаны Замежны аддзел ВЧК — ведамства знешняй разведкі.

**1879 год** — амерыканскі вынаходнік Томас Эдзісан правёў дэманстрацыю работы электрычнай лямпы напальвання.

## Цытата дня

***«Тры рэчы загадкавыя для мяне, і чатырох я не разумею: шляху арла ў небе, шляху змея на скале, шляху карабля сярод мора і шляху мужчыны да жаночага сэрца».***

**Саламон.**

## Усміхнёмся!

**Якіх толькі дыягназаў табе не пажадаюць, калі ты паспрабуеш прарвацца без чаргі да ўрача ў раённай паліклініцы...**

☺

Мужык купіў дачу і расказвае сябру, як там усяго шмат: дом, паляна, сад, басейн, хлеў, нават вулле з пчоламі ёсць.

— А навошта табе пчолы? Ці не прасцей мёду купіць?

— Не ведаю, як наконт мёду, але цешчу ўжо 7 разоў пакусалі!

☺

**Прыбіральніца праз край нахабства набралася. Кажа, калі не падымем зарплату — пойдзе ў кёрлінг...**

☺

— Там Сярожа ў калодзеж зваліўся. Казаў, калі мы яго не выцягнем — ён патоне!

— Ты глядзі, ён нам яшчэ ўмовы ставіць!

## ФаРМАТнём

# Апошні герой — мёртвы герой?..

**З 20 па 23 снежня ў Мінску ў кінатэатрах «Аўрора», «Мір», «Перамога», «Цэнтральны» зноў пройдзе эксклюзіўны паказ фільмаў праекта «КІНАфармат 4х4».**

Кінамайстрамі Украіны і Расіі створана дэтэктыўная кінадрама **«Два ў адным»**. Яе паставіла па сцэнарыю Рэнаты Літвінавай і Яўгена Галубенкі Кіра Муратава. Гэта фільм для тых, хто любіць кіно.

Дзеянне пачынаецца ў тэатры, дзе прама на сцэне павесіўся акцёр Барысаў, які іграў П'еро. Замешаны хтосьці з «тэатральных». Акцёра здымаюць, прыкрываюць... А пасля ходзяць вакол, тоўпяцца, кантактуюць і высвятляюць адносіны. Адначасова манцёр тэатра паспявае абрабаваць труп, але гэта не застаецца незаўважаным, і цяпер ён думае толькі аб адным: ці не забіць непажаданага сведку.

Карціна з вялікім поспехам была паказана на МКФ у Канах. У фільме здымаюцца Рэната Літвінава, Багдан Ступка, Наталля Будзько, Аляксандр Башыраў, Ніна Русланава, Сяргей Бехцераў, Уладзімір Гаранскі.

Хочаш стаць гангстарам? Тады ты павінен зрабіць усё, каб захапіць вышэйшую ўладу. Інакш нават не суйся! Менавіта аб гэтым гаворка ў гангстарскай сазе «Выбары» аб культавага класіка жанру — рэжысёра з Ганконга Джоні То. І вось цяпер на экраны чатырох сталічных кінатэатраў выходзіць працяг **«Выбары-2»**.

Грамадзяне Ганконга глядзяць на перамены ў Кітаі са здзіўленнем, страхам і разгубленасцю. За фасадам эканамічнай стабільнасці пытанні палітычнай аўтаноміі застаюцца без адказу. У цені неадназначнага гіганта пад назвай Кітай што значыць быць «ганконгцам»?

У фільме «Выбары-2» гэта дылема стаіць нават перад гангстарамі. Калі наш галоўны герой Джымі думае аб будучым трыяды, ён, як і многія мясцовыя жыхары, не ведае, якая будучыня чакае Ганконг.

У ролях: Сайман Ям і Луіс Ку. Карціна ўдастоена прыза «За лепшы фільм» Асацыяцыі ганконгскіх кінакрытыкаў, а таксама ўдзельнічала ў Канскім МКФ і праграме «Свет кіно» Маскоўскага МКФ.

У Кітаі знята кінадрама **«Вяселле Туі»**, рэжысёр-пастаноўшчык — Ван Чуанань.

Дзеянне адбываецца ў самым цэнтры кітайскай Манголіі. Пяскі, дзюны. Поўнае зацішша і застой...

Гордая жанчына з моцным характарам Туя, нягледзячы на заклікі ўрада, не хоча пакідаць родную пашу і працягвае жыць у суровых умовах разам з мужам-інвалідам, двума дзецьмі і сотняй авечак. Цяжкая праца ператварае гэту прыгожую і моцную манголку ў змучаную жанчыну. Муж Туі, Батар, пераконвае яе развесціся з ім, але яна не хоча. Нарэшце яна захварэла. Цяпер Туя думае аб разводзе, таму што хоча знайсці жанчыну, якая будзе клапаціцца аб Батары, дваіх дзецях, авечках і абясплоджанай пашы. Але ніводная з прэтэндэнтак не гатова ўзяць на сябе гэту цяжкую ношу.

У галоўных ролях: Нань Ю, Батар, Шэнге, Чжая. На міжнародным кінафестывалі Берлінале-2007 фільм удастоены галоўнага прыза «Залаты мядзведзь» і прыза Экуменічнага журы.

Кінамайстры Францыі выносяць на суд гледачоў кінакамедыю **«Мой лепшы сябар»** рэжысёра Патрыка Леконта.

Францыя, адзінокі гандляр антыкварыятам, высвятляе, што прыяцелі лічаць яго самаўлюбёным эгаістам, няздольным на сапраўдную дружбу. Ён заключае пары з калегай, выйгрыш у якім — грэчаская ваза. За 10 дзён ён павінен завесці сабе лепшага сябра. Францыя выходзіць са становішча, заплаціўшы грошы таксісту Бруна за тое, каб ён прытвараўся яго лепшым сябрам. Поспех мерапрыемства залежыць ад акцёрскай гульні Бруна, але ці ж можна падманваць сяброў?..

У ролі Францыа зняўся Даніэль Атой, у ролі Бруна — Дэні Бун.

**Раман КОСЦІН.**

## Крынічка

*«Цякла тут з лесу невялічка*
*Травой заросшая крынічка».*
**Якуб КОЛАС.**

*Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81* **№ 33 (251)**

## Расліны і прафесіі — Гэта цікава

**Высаджвайце на сваім садова-агародным участку расліны таго знака, што спрыяе заняткам, у асваенні якіх вы хацелі б дабіцца поспеху.**

Калі вы хочаце асвоіць дзейнасць, звязаную з разьбой па дрэве, кройкай і шыццём, аўтамеханікай, рэжучымі інструментамі — высаджвайце расліны Авена. Расліны Цяльца паслужаць тым, хто займаецца рукадзеллем, Блізнят — журналісцкай дзейнасцю, Рака — дапамогуць у занятках з дзецьмі, Ільва — у асваенні артыстычных прафесій, якія патрабуюць натхнення, Дзевы — у сферы абслугоўвання. Расліны Шаляў дапамогуць дабіцца поспеху работнікам суда, а таксама эстэтам-дызайнерам, Скарпіёна — людзям, якія мараць аб грандыёзных адкрыццях. Расліны ж Стральца — дапамогуць духоўным настаўнікам, і тым, хто любіць падарожнічаць, Казярога — лягчэй дасягнуць пастаўленай мэты, расліны Вадалея паслужаць наватарам і ахвотнікам дабіцца поспеху ў нетрадыцыйных сферах, расліны Рыбаў дапамогуць служыцелям царквы, тым, хто вывучае рэлігію.

## Як адчуваюць сябе караняплоды на захоўванні

Прыемна, калі на стол падаюцца прыгожыя, смачныя плады. Але смачнымі бываюць толькі здаровыя караняплоды. Напрыклад, бурачкі салодкія, прыгожага насычанага колеру, адвараныя яны проста растаюць у роце. І раптам, у тых жа вараных бурачках, калі іх парэжаш, паяўляецца гаркаваты смак, цвёрдыя ўчасткі. Караняплод захварэў, хутчэй за ўсё, гэта хвароба — фемоз. Хвароба распаўсюджваецца з дапамогай грыба, паражаецца лісце, сам караняплод. Калі расліна на градцы, то яе не адрозніш ад здаровай. А тут ужо ў сховішчы на месцы цвёрдых участкаў з'яўляюцца пустоты з налётам светлай цвілі.

Каб пазбегнуць гэтай хваробы, высявайце толькі здаровае насенне, рабіце своечасовыя праполкі, пры ўборцы выбракоўвайце парэзаныя і пабітыя караняплоды — вось асноўныя меры барацьбы.

Хварэюць на фемоз і караняплоды сямейства капусных — бручка, рэпа, рэдзька. Узбуджальнік — грыб — заносіцца з насеннем ці з раслінныміі рэшткамі. Пры захоўванні захваэлыя караняплоды пакрываюцца сухімі язвамі, а затым наогул трухнеюць. З дапамогай плодазмену можна пазбегнуць фемозу ўч

Аляксандр КАВАЛЕНКА:

50 год

# «ДАРОГІ ПЕТРЫКАЎСКАГА ДРБУ-112 — ДАРОГІ ЖЫЦЦЯ»

## Дзень учарашні

**— Аляксандр Георгіевіч, сёлета вы адзначылі свой дзесяцігадовы юбілей на пасадзе дырэктара прадпрыемства, якое зараз афіцыйна называецца «Філіял «Петрыкаўскае ДРБУ-112 КПРБУП «Гомельаблдарбуд», а на гэтым тыдні яму спаўняецца паўвека. Што б вы хацелі сказаць з такой нагоды?**

— Па-першае, павіншаваць свой калектыў, які сёння працягвае справы нашых папярэднікаў. Пажадаць персаналу моцнага здароўя і ўсяго самага найлепшага. Па-другое, хачу, як гаворыцца, прыадчыніць некаторыя старонкі гісторыі прадпрыемства.

І пачну з таго, што яно арганізавана ў 1957 годзе і за гэты час мела розныя назвы, хоць прадметам клопату яго было і застаецца адно — дарогі, дарогі і дарогі. Іх будаўніцтва, рамонт і ўтрыманне. Не магу не сказаць пра такі факт. За 50 гадоў дзейнасці нашага ДРБУ на пасту яго кіраўнікоў я аб'ёмамі работы. Уявіце сабе, што мы тады і пасля за год асвойвалі ажно каля 6 мільёнаў рублёў па цэнах таго часу, што было даволі многа, і займалі перадавыя пазіцыі ў сваёй галіне па вобласці. Стараліся, адным словам.

**— Не можа такога быць, каб на вашым шляху, Аляксандр Георгіевіч, не сустракаліся цяжкасці.**

— Іх няма, відаць, у таго, хто не працуе. Самыя вялікія мы пераадольвалі пасля распаду Савецкага Саюза. Тады аб'ёмы работ катастрафічна знізіліся, а за выкананыя часта даводзілася доўга чакаць разлікаў. Заработная плата ўпала, пачаліся скарачэнні рабочых месцаў, і персанал паменшыўся да 130 чалавек. Але ў той цяжкі час, у тую неразбрыху нам усё ж удалося выстаяць. Мы захавалі касцяк калектыву, тэхніку, абсталяванне. Нічога з іх не прадалі, не разбурылі, не парэзалі на метал. Бо верылі, што паступова ўсё пачне наладжвацца. Так яно і адбылося.

• Вадзіцелі Валерый ЮРКАВЕЦ і Валерый КУПРЭЙ.

з'яўляюся ўсяго чацвёртым па ліку. Да мяне іх было тры.

**— Гэта сапраўды рэдкі выпадак, і, напэўна, будзе заканамерна, калі б вы расказалі аб сваіх папярэдніках.**

— Першым начальнікам прадпрыемства быў Іван Міронавіч Таранюк. Ён узначальваў калектыў з 1957 па 1965 год. Яго змяніў Уладзімір Маркавіч Фінкель, які дырэктарскую пасаду займаў ажно 30 гадоў. Потым два гады калектывам кіраваў Павел Сцяпанавіч Солап, якога змяніў я. Безумоўна, мае папярэднікі многае зрабілі, каб прадпрыемства пашыралася, каб умацоўвалася яго матэрыяльна-тэхнічная база, каб выконваліся даведзеныя заданні.

Напрыклад, калі я пачаў працаваць ва ўпраўленні (а тады калектывам кіраваў Уладзімір Маркавіч), мы штогод будавалі па 10—

## Дзень сённяшні

Мы наведаліся на прарабскі ўчастак № 1, якім кіруе Анатоль Чырыч. Едзем па заасфальтаванай вузкай лясной дарозе, раз-пораз саступаючы на ўзмежак яе, бо насустрач адзін за адным паўзуць магутныя МАЗы: недалёка пракладваецца дарога Старушкі—Брынёў — іншыя населеныя пункты. Працягласць яе будзе 14,4 кіламетра. Першая чарга 8,4 кіламетра, і другая — 6.

— Мы ўзводзім, — расказвае Анатоль Аляксандравіч, назіраючы за работай аўтагрэйдэрыста Аляксандра Андрэева, — земляное палатно, робім шчэбеневае пакрыццё, выконваем іншыя неабходныя аперацыі. Працуе тут восем адзінак магутнай тэхнікі. Вунь і экскаватар на МАЗе падвезлі. Задача ў нас такая: свае ра-




15 кіламетраў новых дарог і выраблялі да 60 тысяч тон асфальту. Гэта — вялікія лічбы. І яшчэ: уласнымі сіламі, не наймаючы старонняя арганізацыі, пабудавалі майстэрню, складскія памяшканні, гаражы, адміністрацыйны корпус, бытавыя і вытворчыя памяшканні асфальтабетоннага завода, іншыя аб'екты.

**— Мяркуем, што ваша арганізацыя не была староннім назіральнікам, калі давялося змагацца з наступствамі чарнобыльскага «мірнага атама»...**

— А як жа! То быў вельмі напружаны перыяд, і наша прадпрыемства загрузілі велізарнымі

## ПРАДСТАЎЛЯЕМ СУРАЗМОЎЦУ

***Ураджэнец Нікалаеўскай вобласці Украіны. У Беларусі — з 1967 года, куды пераехалі бацькі з сям'ёй. Школу закончыў у горадзе Петрыкаве, а ў Гомелі — дарожна-будаўнічы тэхнікум. Першыя працоўныя крокі зрабіў у 1984 годзе, калі паводле размеркавання быў накіраваны ў мостабудаўнічае ўпраўленне № 4 на рабочую пасаду цесляра-бетоншчыка.***

***У 1986 годзе пасля службы ў арміі паступіў на працу ў Петрыкаўскае дарожна-рамонтна-будаўнічае ўпраўленне № 112 у якасці дарожнага рабочага. Праз некалькі месяцаў быў прызначаны майстрам, а яшчэ праз некаторы час — прарабам. Пасля завочна закончыў Беларускі політэхнічны інстытут і два гады працаваў галоўным інжынерам у Пастаўскім ДРБУ Віцебскай вобласці, а потым яму прапанавалі такую ж пасаду ў горадзе дзяцінства і юнацтва Петрыкаве, якую ён займаў 6 гадоў. Высокі прафесіяналізм, творчая ініцыятыва Аляксандра Георгіевіча, яго ўменне наладжваць работу з людзьмі былі заўважаны кіраўнікамі адпаведных вышэйстаячых арганізацый, і яму у 1997 годзе прапанавалі ўзначаліць калектыў.***

боты па першай чарзе аб'екта здаць у сакавіку. А потым працягнем іх на другой чарзе дарогі. Зробім усё як належыць.

Наступны наш маршрут ляжаў на базу асфальтабетоннага завода, што недалёка ад чыгуначнай станцыі і населенага пункта Муляраўка. Вядома ж, само прадпрыемства ў гэтыя зімовыя дні прадукцыю для пакрыцця дарог не выпускае, затое тут працуе вытворчая лабараторыя, якой кіруе Таццяна Курдо, ды адзін за адным адсюль з пясчанасалянай сумессю адпраўляюцца МАЗы, пасыпаць ёю слізкія ўчасткі дарог. А за ўсімі работамі сочыць прараб Яўген Рэут, які іх і арганізоўвае.

Пабывалі мы і на паромнай пераправе цераз Прыпяць, дзе вада апошнім часам узнялася больш як на метр. Паром злучае два берагі ракі, дзе раз-пораз у любы час сутак з'яўляецца транспарт, што трымае кірунак з Петрыкава на Мазыр і з Мазыра на Петрыкаў. На гэтай важнай артэрыі жыцця дзяжурылі тры паромшчыкі, якія ў чаканні транспарту ў прыстасаваным памяшканні рыхтавалі сабе абед.

Адным словам, усюды, дзе мы пабывалі, бачылі, што ў людзей ёсць работа, што яны выконваюць яе са стараннем, з ахвотай. Але працягнем дыялог з дырэктарам прадпрыемства Каваленкам.

## І ДРП — таксама

**— Аляксандр Георгіевіч, чым адметны ваш калектыў сёння?**

— У калектыве працуе 180 чалавек. І з гэтай колькасці персаналу 30 заняты на паромных пераправах. Іх у нас дзве: на Мазыр і на вёску Снядзін, на так званую зарэчную зону, дзе маюцца іншыя населеныя пункты. Дарэчы, ад іх жыхароў я ўжо другое скліканне з'яўляюся дэпутатам райсавета.

Першую паромную пераправу наша прадпрыемства абслугоўвае ўвесь час, а другую (яна раней належала калгасу) нам перадалі некалькі гадоў таму. Гэта вельмі важныя службы, якія працуюць кругласутачна на працягу ўсяго года.

**— У тым ліку і зімой?**

— А як жа. Апошнім часам Прыпяць рэдка замярзае, а калі такое здараецца, мы з дапамогай помпы нарошчваем лёд у пэўных месцах, памячаючы праезд транспарту па ім спецыяльнымі вешкамі. Сама ж грузападымальнасць паромаў 60 тон, а цягаюць іх ад берага да берага катэры. Ёсць у нас і рэзервовыя, адзін з якіх набылі нядаўна і гатовы спусціць яго на ваду. Хутка купім і запасны рухавік для катэра.

**— Мяркуючы па ўсім (і гэта мы бачылі на аб'ектах), у ДРБУ нядрэнная матэрыяльна-тэхнічная база?**

• Галоўны бухгалтар Алена ЖУКОЎСКАЯ.
• Калектыў бухгалтэрыі: Тамара ГОЛІК, Зінаіда АЗЕМА, Ірына АСТАШОВА.

— Гэта сапраўды так. Вы ўжо бачылі асфальтабетонны завод, дзе вырабляецца прадукцыя не толькі для патрэб нашага прадпрыемства, але і для іншых арганізацый, якія могуць купіць яе, гэтак жа, як і фізічныя асобы. Маем аўтапарк з магутнымі МАЗамі (дарэчы, сёлета атрымалі дзве новыя такія машыны), 6 трактароў з неабходным навясным абсталяваннем — кампрэсары, фрэзы, касілкі і г.д. — з прычэпамі. Ёсць такама аўтобусы для перавозкі людзей, два экскаватары, бульдозер, пагрузчык і іншае. Апошнім часам у нас з'явіліся мабільныя «Газелі» для перавозкі брыгад з 4—5 чалавек з неабходным інвентаром. Адзінае, з чым цяжкавата, дык гэта тое, што ў нас усяго тры аўтагрэйдэры, калі не ўлічваць прычапны. Малавата, вядома, але ўсё ж з работамі спраўляемся і спадзяёмся, што сітуацыя неўзабаве выправіцца, бо дапамогу ў гэтым пытанні абяцае аказаць галаўное прадпрыемства «Гомельаблдарбуд».

• Прараб асфальтабетоннага завода Яўген РЭУТ
• Інжынер-лабарант Таццяна КУРДО і лабарант Людміла АГУРЦОВА.

**— Ваш Петрыкаўскі раён па сваіх памерах даволі вялікі. А ці азначае гэта, што, рамантуючы тыя ці іншыя ўчасткі дарог, вы кожны дзень вымушаны вазіць людзей і дастаўляць тэхніку ў аддаленыя месцы?**

— А навошта? У шэрагу мерапрыемстваў па эфектыўнай рабоце, эканоміі, зніжэнні затрат мы, бадай што, першымі ў сістэме «Гомельаблдарбуда» стварылі так званы ДРП (дарожна-рамонтны пункт), які знаходзіцца за 40 кіламетраў ад райцэнтра на мяжы з Любанскім і Акцябрскім раёнамі. Там у нас працуе 6 чалавек з начальнікам участка Аляксеем Харламавым. Гэта мясцовыя жыхары, якія сочаць за станам дарог у тым рэгіёне, рамантуюць і ўтрымліваюць іх, для чаго ёсць усё неабходнае: трактары, грэйдэр, аўтобус для перавозкі людзей, касілкі, прычэпы і г.д. Нядаўна мы перадалі туды новы мабільны аўтамабіль «Газель», а ДРП мы арганізавалі сем гадоў таму па прыкладу ДРБУ з Пастаў, дзе я ў свой час працаваў. Практыкуем мы і такое. Для нашых рабочых, якія працуюць на іншых аддаленых участках дарог, на пэўны час, калі можна так сказаць, арандуем у тых населеных пунктах жылыя памяшканні.

## Дзень сённяшні

За 11 месяцаў наш калектыў уласнымі сіламі асвоіў 8640 мільёнаў рублёў, вытрымаўшы зададзеныя тэмпы росту вытворчасці. Зроблены бягучы рамонт 17 кіламетраў дарог, вялікія аб'ёмы работ выкананы па добраўпарадкаванні райцэнтра.

Сёлета калектыў быў заняты і на аб'ектах аграгарадкоў Лясківічы і Конкавічы. Дарэчы, першым такім аб'ектам быў аграгарадок Чалюшчавічы, дзе мы заасфальтавалі ўсё запланаванае: цэнтральныя вуліцы, тратуары, мехдвор і г.д. У праграмах аграгарадкоў таксама добраўпарадкаванне малочна-таварных фермаў, складоў, збожжасушыльных комплексаў і да т.п. Сёлета на работы па аграгарадках было адпушчана каля 600 мільёнаў рублёў. Праграмай наступнага года прадугледжаны ўвод аграгарадкоў Камаровіч і Пцічы, дзе мяркуецца асвоіць каля двух мільярдаў рублёў.

За вялікі гонар калектыў лічыць запрашэнне вышэйстаячых арганізацый узяць удзел у складзе «Гомельаблдарбуда» ў падрыхтоўцы аб'ектаў сёлетніх рэспубліканскіх «Дажынак», што адбыліся ў верасні ў горадзе Рэчыцы. Там нам было даручана ўкласці бартавы камень на вуліцах Савецкай і імя Дастаеўскага, добраўпарадкаваць жылы мікрараён «Дняпроўскі», выканаўшы цэлы комплекс работ. І брыгады справіліся з гэтым.

У сваім раёне калектыў быў заняты таксама на рамонце дарогі Петрыкаў — Жыткавічы, аўтобусных прыпынкаў, пад'ездаў да вёсак і г.д. Адным з галоўных паказчыкаў калектыву з'яўляецца тое, што былі вытрыманы тэмпы павышэння прадукцыйнасці працы і заработнай платы. Суадносіны паміж імі парушаны не былі.

## Сплаў вопыту і маладога запалу

**— Дарэчы, Аляксандр Георгіевіч, якая ў калектыве сярэдняя зарплата?**

— 510 тысяч рублёў. Калі гаварыць увогуле, як бачыце, людзі атрымліваюць не надта многа. На гэты паказчык уплывае тое, што ў нас свая ахова, дзе заробкі, як і ў работнікаў паромнай службы, невялікія, але іх выплата робіцца без спазненняў, у строга прызначаныя тэрміны. Затрымак ніколі не бывае.

**— А цяжка ўладкавацца да вас на працу?**

— Няпроста. Калектыў у нас стабільны. Большасць людзей працуе па 10, 20, а то і больш гадоў. Уявіце сабе, што ў чарзе на атрыманне жылля знаходзіцца ўсяго 6 чалавек. У многім гэта тлумачыцца тым, што яшчэ ў савецкі перыяд наша арганізацыя пабудавала тры дамы на 100 кватэр (нагадаю пры гэтым, што сёння наш персанал — гэта 180 чалавек). На асфальтабетонным заводзе маецца лазня, невялікі басейн, пакой адпачынку, а на цэнтральнай базе ў Петрыкаве мы вядзём рэканструкцыю душавых. Усе рабочыя забяспечваюцца спецадзеннем. У адным з былых складоў паставім спартыўнае абсталяванне.

• Матросы Мікалай МАРОЗЬКА, Віктар ПЯТРОЎ і матарыст Віктар СТРАКАЧ
• Паромная пераправа цераз раку Прыпяць.

**— Вось перад намі дыплом вашай спартыўнай каманды, узнагароджанай за другое месца ў спаборніцтвах па більярдзе, якія праводзіліся сярод структурных падраздзяленняў «Гомельаблдарбуда». А вунь цэлы куточак са спартыўнымі трафеямі-кубкамі. Гэта значыць, што ў вас нядрэнна наладжана фізкультурна-спартыўная работа. Правільна?**

— Правільна. Яна асабліва актывізавалася, калі на працу да нас пасля заканчэння дарожна-будаўнічага тэхнікума прыйшоў Дзмітрый Прымак, за якім пацягнулася моладзь. Мы пачалі ўдзельнічаць ва ўсіх раённых спаборніцтвах і значна паправілі свае пазіцыі ў круглагадовай спартакіядзе «Гомельаблдарбуда». Напрыклад, летась заваявалі ў ёй трэцяе прызавое месца.

**— Мы, Аляксандр Георгіевіч, ведаем, што ў вашым калектыве добра зарэкамендавала сябе рабочая дынастыя Прымакоў. Дзмітрый не з той кагорты?**

— З той самай. Дынастыя пайшла ад токара Яфіма Цімафеевіча і яго жонкі, якая працавала прыбіральшчыцай. Іх сын, Мікалай Цімафеевіч, займаў пасады майстра і прараба. Раўняючыся на сваіх родных, па іх шляху пайшлі сыны Мікалая Аляксей і Дзмітрый. Першы за кошт нашай арганізацыі атрымаў вышэйшую адукацыю ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транстарту і цяпер працуе аператарам змяшальнай установкі. Дзмітрый жа пасля школы пайшоў вучыцца ў дарожна-будаўнічы тэхнікум і атрымаў у нас пасаду майстра. Сёння ж ён прараб і завочна павышае свае веды ў тым жа самым універсітэце.

Наступная рабочая дынастыя Хамцоў. Мікалай Максімавіч і яго жонка працавалі тут з дня заснавання прадпрыемства і перадалі эстафету сваёй дачцэ Ніне Макарэвіч (прозвішча па мужу). Цяпер яна начальнік участка па ўтрыманні дарог. Такую ж самую пасаду займае і яе брат Валерый, які закончыў дарожна-будаўнічы тэхнікум.

• На будаўнічым участку № 1 аўтадарогі Старушкі—Брынёў—Н.Келі старшы прараб Іван ВЕКА, прараб Анатоль ЧЫРЫЧ і машыніст аўтадрэйзера Аляксандр АНДРЭЕЎ.

**— А нам старшы прараб Іван Іванавіч Века расказваў, што і ваша старэйшая дачка Марына пасля заканчэння БНТУ працуе ў Мінску ў адной з дарожна-будаўнічых арганізацый. Гэта так?**

— Так. У сваю чаргу я хачу заўважыць, што і Векі — дынастыя дарожнікаў. Дзядуля, бабуля, бацька, маці і брат Івана Іванавіча сваім лёсам звязаны з гэтай прафесіяй. Толькі, праўда, у Калінкавічах. Добрых слоў заслугоўваюць таксама муж і жонка Власкіны. Мікалай доўгі час працаваў вадзіцелем, а зараз — дарожны рабочы. Вольга дваццаць гадоў была занята на ўкладцы асфальту і цяпер працуе прыбіральшчыцай службовых памяшканняў. Усё жыццё працаваў у нас Міхаіл Сцяпанавіч Серапін, і, відаць, тым самым паўплываў на сваю дачку, якая выбрала прафесію дарожніка. Сёння Таццяна Курдо (прозвішча па мужу) — загадчыца вытворчай лабараторыі, поспехі калектыву якой — адны з лепшых у «Гомельаблдарбудзе».

**— Напэўна, заснавальнікі працоўных дынастый на заслужаным адпачынку?**

— І не толькі яны. У нас налічваецца 34 пенсіянеры. Пра іх мы не забываем. Яны часам і самі завітваюць на прадпрыемства, і мы наведваем іх. Ніколі не адмаўляем у просьбах аказаць матэрыяльную дапамогу, завезці дровы, дапамагчы ў іх распілоўцы. Віншуем са святамі, уручаем падарункі. Вось і зараз запрасілі іх на юбілей упраўлення, якому яны аддалі многія гады жыцця.

Апошнім часам у калектыў улілося нямала моладзі. Такім чынам, і гэта натуральны працэс, ідзе яго абнаўленне. Мы вось падлічылі, што да 2012 года на пенсію адправіцца 60 чалавек. На іх месцы прыйдуць новыя людзі, якіх давядзецца навучаць. І мы да гэтага гатовыя. Упэўнены, што яны памножаць працоўныя здабыткі сваіх папярэднікаў. Інакш і быць не можа: жыццё працягваецца.

**— Нам сказалі, што на вашым прадпрыемстве цякучасць кадраў вельмі нізкая. Чым гэта тлумачыцца?**

— Калектыў наш дружны, згуртаваны. Людзі звальняюцца з работы па ўласным жаданні: нехта знайшоў больш аплатную работу, нехта кудысьці пераязджае, змяняе месца жыхарства і г.д. Злосных парушальнікаў дысцыпліны ў нас няма. І кіраўнікі ўпраўлення, і спецыялісты, і рабочыя працуюць на даверлівай аснове, павазе адзін да аднаго. Мы — адна каманда.

**— Значыць, можна сказаць, што ваш калектыў — гэта сплаў вопыту старэйшых і запалу маладых?**

— А чаму ж не! Маякамі вытворчасці з'яўляюцца работнікі розных узростаў: вадзіцелі Віктар Шпігановіч, Сяргей Лявоненка, Віктар Кушняроў, трактарыст Віктар Асташоў, галоўны бухгалтар Алена Жукоўская, намеснік дырэктара Аляксандр Бекарэвіч, начальнік планава-вытворчага аддзела Ала Фралова, галоўны механік Мікалай Нікель... Ды ўсіх ці пералічыш у гэтым невялікім матэрыяле? Людзі сапраўды стараюцца, не лічачыся з часам, пераадольваючы цяжкасці. І я ўдзячны ім за гэта. Наш калектыў выказвае шчырую ўдзячнасць генеральнаму дырэктару «Гомельаблдарбуда» Вадзіму Міхайлавічу Краўчанку, старшыні райвыканкама Мікалаю Пятровічу Астаповічу, яго намесніку Аляксандру Фёдаравічу Майсееву за тую падтрымку, якую яны аказваюць нам. Яшчэ раз віншую калектыў з паўвекавым юбілеем! З надыходзячым Новым годам, паважаныя таварышы!

**Матэрыял падрыхтавалі Алена ДАЎЖАНОК, Уладзімір ПЕРНІКАЎ. Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**

**ФІЛІЯЛ «ПЕТРЫКАЎСКАЕ ДРБУ-112 КПРБУП «ГОМЕЛЬАБЛДАРБУД» ЗАПРАШАЕ СУБ'ЕКТЫ ГАСПАДАРАННЯ І ФІЗІЧНЫХ АСОБАЎ ДА ЎЗАЕМАВЫГАДНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА.**

247940, г. Петрыкаў,
Гомельская вобласць,
вул. Першамайская, 73.
тэл. (факс) 2 35 83. Прыёмная 5 33 73.

Ліцэнзія № 02250/0193718 ад 15.03.2004 г. сапраўдная да 15.03.2009 г. УНП 400164128.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЁЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287-19-19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287-18-64, падпіскі і распаўсюджвання — 287-18-51, юрыдычнага — 287-19-68, сакратарыята — 292-05-82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292-44-12; «Мясцовае самакіраванне» — 292-21-03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20-37-98, Віцебску: 24-31-92, Гродне: 43-25-29, Гомелі: 74-13-92, Баранавічах: 7-26-02, Магілёве: 32-74-31; бухгалтэрыі: 292-22-03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287-17-79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292-04-52.
html: www.zviazda.by; www.zviazda.by/ru/main (*новая версія, якая тэсціруецца*)
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.460 Індэкс 63850. Зак. № 6953. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12